Калматы і хвастаты фатограф па мянушцы Федзя траціць ганарары на мяса, у сацыяльнай сетцы дадае па 300 сяброў за раз і, магчыма, будзе здымаць вяселле сяброўкі сваёй гаспадыні. СТАР 3

Пасля наведвання Белавежскай пушчы турыст пакідае на сувеніры ў сярэднім усяго 20 цэнтаў. І ўсё таму, што цікавую аўтэнтычную рэч у бойкіх месцах не надта і купіш. СТАР 4

Возьмем выпадак, ад якога не застрахаваны ніхто: пакласці вопратку ў пральную машыну і толькі пасля ўспомніць, што ў кішэні ляжаць грошы... Што тады рабіць? СТАР 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

1 ЛІСТАПАДА 2012 г. ЧАЦВЕР № 212 (27327) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАЗНАЧЫЎ НОВАЕ КІРАЎНІЦТВА СПАРТЫЎНАЙ ГАЛІНЫ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 31 кастрычніка разгледзеў кадравыя пытанні.

Кіраўнік дзяржавы назначыў Шамко Аляксандра Ігаравіча міністрам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь.

Рыжанкоў Максім Уладзіміравіч назначаны памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму.

Аляксандр Лукашэнка таксама ўнёс у Выканкам Нацыянальнага алімпійскага камітэта кандыдатуру Рачкоўскага Ігара Анатольевіча для яго выбрання першым віцэ-прэзідэнтам НАК Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт адзначыў, што Аляксандр Шамко — чалавек у спорце не выпадковы. У Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях ён курыраваў зборную каманду па пажарна-выратавальным спорце, якая чатыры разы станавілася чэмпіёнам свету (найбольшая колькасць перамог прадстаўнікоў адной краіны ў гісторыі гэтага віду спорту).

Ігар Рачкоўскі цяпер узначальвае Беларускую федэрацыю паруснага спорту, добра знаёмы з пытаннямі развіцця спорту вышэйшых дасягненняў.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў ад нованазначаных без прамаруджвання пачаць работу.

Гэтыя кадравыя рашэнні былі прыняты напярэдадні пасяджэння Выканкама НАК, на якім будуць вырашаны ўсе асноўныя арганізацыйныя пытанні дзейнасці абноўленага Выканкама, вызначаны задачы віцэ-прэзідэнтаў і кожнага члена Выканкама.

У мэтах развіцця рашэнняў праведзенага на мінулым тыдні алімпійскага сходу Выканкаму трэба будзе абмеркаваць і зацвердзіць найбольш актуальныя аспекты функцыянавання алімпійскага руху Беларусі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ВЫСОКІЯ ВЫНІКІ АЙЧЫННЫХ СПАРТСМЕНАЎ ПАВІННЫ СТАЦЬ СІСТЭМАЙ

Беларускі спорт трэба ўзняць на больш высокі ўзровень, а добрыя вынікі беларускіх спартсменаў павінны стаць сістэмай. Аб гэтым заявіў учора кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй Кабякоў, прадстаўляючы новага міністра спорту і турызму Аляксандра Шамко, перадае БЕЛТА.

Андрэй Кабякоў адзначыў, што калектыву Мінспорту пашанцавала з новым міністрам — гэта вопытны і па-сапраўднаму баявы генерал, які прайшоў шлях ад камандзіра аддзялення да генерал-маёра ўнутранай службы, намесніка міністра па надзвычайных сітуацыях. Яго вызначаюць уважлівыя адносіны да ўсіх даручаных спраў, дысцыплінаванасць, дакладнасць выканання задач, што пацверджана дзяржаўнымі ўзнагародамі. Працоўная дзейнасць Аляксандра Шамко звязана з пажарнай службай, літаральна пазаўчора ён прымаў непасрэдны ўдзел у ліквідацыі наступстваў аднаго са здарэнняў. СТАР 2

БЕЛАРУСЬ ФАКТЫЧНА ПРАЦУЕ ПА ПРАВІЛАХ СГА

Аб гэтым заявіў учора прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на ўрачыстай цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод заслужаным людзям краіны, перадае БЕЛТА.

«Беларусь як краіна з адкрытай эканомікай з 2012 года ўключылася ў Адзіную эканамічную прастору, а пакалькі наш партнёр Расія стала членам СГА, то мы фактычна таксама працуем па правілах Сусветнай гандлёвай арганізацыі», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. Ён прызнаў, што работа па новых правілах ускладняе дзейнасць суб'ектаў гаспадарання, пакольк ўзровень тарыфнай абароны для беларускіх вытворцаў некалькі зніжаецца. «Але трэба працаваць ва ўмовах адкрытай канкурэнцыі, — падкрэсліў прэм'ер-міністр. — Будзем мы працаваць ва ўмовах адкрытай канкурэнцыі — і да нас будуць прыходзіць тавары без адпаведных абцяжарванняў. Таму наша задача — вырабляць прадукцыю з мінімальнымі выдаткамі».

Сёння Беларусь мае патрэбу ў кансалідацыі намаганняў заслужаных людзей краіны, каб вырашыць вельмі складаныя задачы, якія трэба рэалізаваць у 2012 годзе і ў наступныя гады пяцігодкі, адзначыў кіраўнік урада. У будучым годзе ў Беларусі неабходна забяспечыць тэмп росту ВУП 108,5 працэнта, тэмп росту экспарту — 115,2 працэнта. А па выніках 2012 года чакаецца, што экспарт Беларусі ўзрасце больш як на 19 працэнтаў. Разам з гэтым трэба забяспечыць дадатнае сальда знешнегандлёвага балансу. СТАР 2



ВЯСЕЛЛЕ Ў ЗАВІРУХУ — ДА ШЧАСЦЯ!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

г. Быхаў

ЛІЧБА ДНЯ

На 64%

у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічыўся агульны аб'ём прамых замежных інвестыцый у эканоміку Мінскай вобласці ў студзені—верасні гэтага года і склаў $393,6 млн. Найбольшы аб'ём ПЗІ на чыстай аснове прыцягнуты ў прамысловасць — $ 27 млн (36,5%), з іх $ 26,3 млн інвестыцый паступілі ў апрацоўчую прамысловасць. У гандаль замежныя інвестары накіравалі $ 24,6 млн, для ажыццяўлення аперацый з нерухомай маёмасцю, арэндай і прадастаўленнем паслуг спажыўцам — $ 9,6 млн, у сферы транспарту і сувязі — $ 9,4 млн. Па выніках дзевяці месяцаў найбуйнейшымі краінамі-інвестарамі з'яўляюцца Літва (33,5% агульнага аб'ёму ПЗІ), Кіпр (11,4%), Азербайджан (9,6%), Нідэрланды (6,9%), Іран (6%), Германія (6%), Злучанае Каралеўства Вялікабрытанія (5,1%), Расія (3%).

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 7°
Віцебск	+ 3°
Гомель	+ 1°
Гродна	+ 8°
Магілёў	+ 4°
Мінск	+ 5°

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 01.11.2012 г.

Долар ЗША	8510,00	▼
Еўра	11 000,00	▼
Рас. руб.	270,50	■
Укр. грыўня	1043,53	▲

■ Погляд

ЯК ВЫКАРАНІЦЬ П'ЯНСТВА ЗА РУЛЁМ?

Якія меры па ўзмацненні адказнасці ў адносінах да п'яных кіроўцаў разглядаюцца цяпер у Беларусі? І ці дапаможа «метад папругі» скараціць колькасць ДТЗ? На гэтыя і іншыя пытанні «Звязда» шукала адказы ў кампетэнтных спецыялістаў.

— Размовы пра канфіскацыю аўтамабіляў за кіраванне нападпітку вядуцца ў Беларусі ўжо каля 5 гадоў. Аднак рашэнне дагэтуль не прынята...

— У пачатку жніўня Прэзідэнт даручыў Генеральнаму пракурору прыняць дадатковыя меры па ўзмацненні адказнасці ў дачыненні да п'яных кіроўцаў, — нагадаў **Уладзімір КРУКОЎСКІ, старшы пракурор аддзела па наглядзе за выкананнем правоў і свабод грамадзян Генеральнай пракуратуры Беларусі**. — Як вынік, пад эгідай Генпракуратуры была створана міжведамасная рабочая група, якая і распрацавала законапраект са шматлікімі прапановамі.

❑❑❑

Што прапаноўвае Генпракуратура?

— Мы прапануем за ДТЗ са смяротным зыходам (альбо ў выніку якога людзі атрымалі цяжкія траўмы), увесці канфіскацыю аўтамабіля, — паведаміў Уладзімір Крукоўскі. — Такі падыход прымяняецца ў Францыі і Люксембургу, ЗША і іншых краінах. Так, пасля таго як у Літве ўвялі канфіскацыю аўтамабіля за кіраванне ім у стане ап'янення — у 2 разы скарацілася колькасць такіх парушэнняў.

— А калі за рулём едзе не ўласнік аўто, то што?

За апошнія 10 гадоў у Беларусі па віне нецвярозых кіроўцаў загінулі 2067 чалавек. Для параўнання, за 10 гадоў ваенных дзеянняў у Афганістане загінулі 770 беларусаў.

— Гэтае пытанне якраз было прадметам гарачых спрэчак. У выніку мы прыйшлі да меркавання, што трэба ўводзіць канфіскацыю ў дачыненні да ўсіх кіроўцаў, незалежна ад таго, у чыёй уласнасці знаходзіцца транспартны сродак. Паколькі, па статыстыцы, у нас у рэспубліцы ўласнікі кіруюць 30% аўтамабіляў, астатнія — па даверанасці, альбо члены сям'і.

— А ўласнік можа потым вярнуць машыну?

— Згодна з заканадаўствам, так.

— Як вы лічыце, дапаможа ўзмацненне адказнасці скараціць колькасць няшчасных выпадкаў?

— Безумоўна. Усе тыя меры, у тым ліку і па прафілактыцы, якія мы прымаем, будуць, на маю думку, спрыяць скарачэнню такіх правапарушэнняў і злачынстваў і палепшаць сітуацыю з гібеллю людзей на дарогах.

Акрамя канфіскацыі, новы законапраект прадугледжвае ўвядзенне і іншых новых відаў пакарання за кіраванне нападпітку. У прыватнасці, калі чалавек папаўся п'яным за рулём другі раз, то ён можа атрымаць два гады турмы. Калі п'яны кіроўца дагэтуль ужо быў судзімы за падобнае злачынства — яму будзе пагражаць да 3 гадоў пазбаўлення волі. «За парушэнне правілаў дарожнага руху ў стане ап'янення, што пацягнула па неасцярожнасці смерць чалавека альбо прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, прапануем увесці адказнасць ад 4 да 7 гадоў пазбаўлення волі. За гэтыя ж дзеянні, якія пацягнулі па неасцярожнасці смерць двух або больш чалавек, — прадугледжана пазбаўленне волі на тэрмін ад 5 да 10 гадоў». СТАР 2

БЕЛАРУСЫ ГАЛАСУЮЦЬ ЗА ЗАХАВАННЕ ДЗЕЮЧАЙ СІСТЭМЫ РАЗЛІКАЎ ЗА ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЮ

Больш за 46 тыс. чалавек на ўчора прынялі ўдзел у галасаванні, размешчаным на сайце ДВА «Белэнерга». Пры гэтым 93 працэнты прагаласаваўшых выказаліся за захаванне дзеючай сістэмы разлікаў за электраэнергію і толькі 7 працэнтаў — за ўвядзенне дыферэнцыраванай аплаты электрычнасці, паведамляе БЕЛТА.

Шырокае грамадскае абмеркаванне варыянтаў разліку за электраэнергію стартавала ў Беларусі ў верасні і завяршылася 31 кастрычніка. На працягу двух месяцаў беларусы маглі выказацца аб тым, якая сістэма аплаты электраэнергіі, на іх погляд, з'яўляецца лепшай. На выбар прапанавана два варыянты.

Першы з іх прадугледжвае захаванне дзеючай сістэмы разліку (адналькавая сума за кожную кВт.гадз), але з больш інтэнсіўным павышэннем тарыфаў. Другі варыянт прадугледжвае ўкараненне дыферэнцыраванай схемы, згодна з якой пэўны аб'ём энергіі прапануецца аплачваць па льготных цэнах, а звыш гэтай нормы — па больш высокіх. Пры гэтым тарыфы на электраэнергію павышацца будуць, але меншымі тэмпамі. Малазабяспечаныя грамадзяне і шматдзетныя сем'і могуць разлічваць на бюджэтную субсідыю.

Беларусы маглі прагаласаваць за адзін з варыянтаў, а таксама выказаць сваё меркаванне і задаць пытанні ў тым ліку на сайтах ДВА «Белэнерга», Мінэнерга, Мінгарвыканкама, шасці абласных энергазабеспячальных арганізацый, па тэлефонах гарачых і прамых ліній. Учора быў апошні дзень, калі гэта можна было зрабіць.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БЕСПРАЦОЎЕ Ў ЕЎРАЗОНЕ ВЫРАСЛА Ў ВЕРАСНІ ДА 11,6%

Беспрацоўе ў 17 краінах еўразоны ў верасні 2012 года дасягнула 11,6%, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на Еўрастат. У жніўні паказчык беспрацоўя склаў 11,5%. Даныя за верасень з'яўляюцца рэкордным максімумам з пачатку адсочвання ў 1995 годзе. У цэлым па 27 краінах Еўрасаюза беспрацоўе за верасень засталося на ўзроўні жніўня — 10,6%.

У верасні гэтага года ў краінах Еўрасаюза налічвалася 25,751 млн беспрацоўных, з якіх 18,49 млн знаходзіліся ў еўразоне. У параўнанні з сёлетнім жніўнем колькасць беспрацоўных павялічылася на 169 тыс. у ЕС і на 146 тыс. — у еўразоне. У адносінах да верасня 2011 года рост беспрацоўных склаў 2,145 млн і 2,174 млн адпаведна.

Самы нізкі паказчык беспрацоўя сярод дзяржаў еўразоны зафіксаваны ў Аўстрыі (4,4%), Люксембургу (5,2%), Германіі і Нідэрландах (5,4%), а самы высокі — у Іспаніі (25,8%) і Грэцыі (25,1%).

ЭКСПЕРТЫ ААН: ПРАЗ 40 ГАДОЎ ХАРЧАВАННЕ БАНАНАМІ СТАНЕ АЛЬТЭРНАТЫВАЙ ГОЛАДУ

Глабальнае пацяпленне ў бліжэйшыя 40 гадоў прывядзе да таго, што ў многіх рэгіёнах свету традыцыйныя сельскагаспадарчыя культуры перастануць даваць ураджай, які дазваляе пракарміцца, гаворыцца ў справаздачы экспертаў Міжнароднай праграмы даследаванняў змяненняў клімату, сельскагаспадарчай і харчовай бяспекі ААН (CCAFS). Першымі з праблемай сутыкнуцца жыхары Афрыкі, Паўднёва-Усходняй Азіі і Лацінскай Амерыкі.

Традыцыйныя для гэтых рэгіёнаў сельскагаспадарчыя культуры — розныя віды травы, рыс, бульба — альбо перастануць расці зусім, альбо пачнуць даваць ураджай, які ўжо не зможа пракарміць тых, хто яго вырошчвае. Да гэтага прывядзе павелічэнне сярэднегадавой тэмпературы і тое, што клімат у рэгіёнах стане больш засушлівым.

Культуры, традыцыйныя для гарачых краін (такія, як бананы), наадварот, стануць даваць небывала багатыя ўраджаі нават у тых шыротах, дзе зараз ніхто і не спрабуе іх вырошчваць.

Верагоднасць такога сцэнарыя настолькі вялікая, што харчовая і сельскагаспадарчая праграма ААН ужо сёння рыхтуе шэраг мер, якія дазволяць зрабіць пераход сельскагаспадарчых вытворцаў шэрагу рэгіёнаў на нязвыклыя для іх віды культур як мага менш балючым.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

НЯМЕЦКІЯ ТУРКІ ШТОГОД АДПРАЎЛЯЮЦЬ НА РАДЗІМУ МІЛЬЯРД ЕЎРА

Нямецкія туркі штогод адпраўляюць у Турцыю каля мільярда еўра з тых грошай, якія яны атрымліваюць у Германіі, піша Handelsblatt са спасылкай на даследаванне сацыялагічнага інстытута Info. Амаль кожны трэці турак, які пражывае ў ФРГ, рэгулярна або час ад часу пераводзіць грошы сваякам, якія засталіся на радзіме. У сярэднім гэтая сума дасягае 1,3 тысячы еўра ў год на чалавека, што ўвогуле складае каля мільярда еўра ў год для ўсёй турэцкай абшчыны.

Пры гэтым частка грошай, якія адпраўляюцца ў Турцыю, — гэта не лішкі заробкаў імігрантаў, а сацыяльная дапамога ад нямецкіх улад. 17 адсоткаў нямецкіх туркаў атрымліваюць фінансавую дапамогу ад дзяржавы. Толькі 57 адсоткаў апытаных заявілі, што жывуць на ўласны заробак.

КАРОТКА

Пераважная колькасць зваротаў у Мінгарвыканкам датычыцца жылля — узвядзення жылых дамоў, адсялення ў сувязі са зносам, атрымання льготных крэдытаў. За студзень—верасень у гэтай тэме паступіла 2,4 тыс. зваротаў, што на 643 звароты, або на 36 працэнтаў, больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

Беларусь з 1 лістапада 2012 года знізіць экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты. Экспартная пошліна на сырую нафту з 1 лістапада знізіцца з $418,9 да $404,5 за 1 тону. На таварныя бензіны і прамагонны бензін стаўка вывазных мытных пошлін зыходзячы з каэфіцыента 0,9 складзе $364,1 замест $377 за 1 тону ў кастрычніку.

Салдат тэрміновай службы, кіроўца запраўшчыка, загінуў у выніку няшчаснага выпадку пры правядзенні работ на запраўцы (дэмантажы даху) у адной з вайсковых часцей Беларусі, паведамілі ў Міністэрстве абароны.

БЕЗ ЧАГО НЕ АБЫХОДЗІЦЦА МОЙ ЗВЫЧАЙНЫ ДЗЕНЬ?

Галоўны рэдактар партала Diva.by Кацярына МОРГАЛЬ:

— Добры дзень не намалюецца без добрай музыкі. А ў такое надвор'е сонечны рэгі — як вітаміны. Таму штодня — сонечная музыка ў навушніках. І дома, і на працы. Восень для мяне — абавязкова смачны гарачы чай. Сяброўка нядаўна прывезла з Літвы пачак чаю з імбірам, лімонам і жэньшэнем. Саграваюся!!! Імкнуся, каб дзень не праходзіў без ёгі. Паўнацэнную практыку сем разоў на тыдні, на жаль, дазволіць сабе не магу. Але імкнуся выконваць хоць бы дыхальныя практыкаванні — пранаямы. З іх выдатна пачынаць раніцу — зусім па-іншаму працуецца!

Спецыяліст па інфармацыі і камунікацыі РУП «Белтэлекам» Аліна ГУШЧО:

— Дзень спецыяліста па сувязях з грамадскасцю не абыходзіцца без стасункаў. Зразумела, што гэтыя працоўныя стасункі — добрыя, і абавязкова з усмешкай. Але, разам з тым, ніводзін мой дзень не абыходзіцца без усмешак блізкіх і дарагіх мне людзей!

Студэнтка 6 курса Расійскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя А.І. Герцэна (г. Санкт-Пецярбург) Святлана УЛАСІК:

— Любы дзень пачынаецца з працяглага пляскання ў ванным пакоі. Для мяне гэта — неверагоднае задавальненне, а для блізкіх — жах, асабліва калі яны спяшаюцца на працу... Як ні дзіўна гэта прагучыць, але мой класічны сняданак — гэта... суп! Я яшчэ ў школе, калі на нямецкай мове адказвала на пытанне «Што вы ўжываеце на сняданак?», пісала: «Некалькі лыжак супу». Наогул штодня я «лічу калорыі», сачу за тым, што ем. Як правіла, дзень не абыходзіцца без фітнэсу, або саўны, або лазні, або басейна. У мяне абанемент у фітнэс-цэнтр адразу на год! Ну, і абавязковы прагляд навін у інтэрнэце. Асабліва мяне цікавяць навіны спорту.

Святлана БАРЫСЕНКА.

БЕЛАРУСЬ ФАКТЫЧНА ПРАЦУЕ ПА ПРАВІЛАХ СГА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Нам неабходна прадаваць выгадна, пры гэтым 65 працэнтаў прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння і не менш як 20 працэнтаў сельгаспрадукцыі трэба прадаваць на экспарт», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. Гэта няпростая задача, і далейшае павелічэнне тэмпаў эканамічнага развіцця Беларусі магчыма толькі за кошт росту прадукцыйнасці працы і павышэння канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі на знешніх рынках. «Наша стратэгія росту заснавана на інавацыях, новых праектах, вопыце працоўных калектываў, на тым, што рэкамендуюць адпаведныя міністэрствы і ведамствы. І кожны працэнт, кожная капейка вырашаюць пытанні канкурэнтаздольнасці. Будуць аб'ёмы, будзе экспарт, будуць і дастойная заработная плата, дастойныя даходы насельніцтва, над гэтым сёння працуе ўрад». Прэм'ер-міністр заўважыў, што Беларусь разлічвае ў асноўным на ўласныя сілы. «Ніхто не прыйдзе з-за мяжы, каб вырашаць нашы праблемы», — лічыць ён.

У сувязі з гэтым дзяржава разлічвае на высокі чалавечы патэнцыял, падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч, звяртаючыся да атрымаўшых сёння высокія ўзнагароды дзяржавы за дасягненні ў сваёй рабоце. Сярод іх работнікі прамысловасці, сельскай гаспадаркі, будаўнічай галіны, гандлю, транспарту і сувязі. У ліку ўзнагароджаных — працаўнікі ВА «Беларуснафта», РПУП «Завод газетнай паперы», ААТ «Пеленг», агракамбіната «Сноў», «Белпошты», «Белтэлекама», установаў адукацыі, а таксама творчыя калектывы, спартсмены.

Прэм'ер-міністр звярнуў увагу на дасягненне высокіх вынікаў беларускіх спартсменаў, у тым ліку на нядаўна праведзеных Алімпійскіх гульнях у Лондане. Асабліва ён адзначыў работу трэнераў па тэнісе Валянціны Ржаных і Самуэля Сімука, якія выхавалі гордасць Беларусі — Вікторыю Азаранка. «Цудоўна, што наша краіна, грамадства, эканоміка развіваюцца гарманічна, што прымнажае багацце беларускага народа. Мы павінны берагчы згоду ў беларускім грамадстве, такая згода ёсць і будзе заўсёды ў адзінстве інтарэсаў дзяржавы, грамадства і чалавека».

■ Саюзная дзяржава

Наша Нянашава

«Падрыхтоўка расійскіх школьнікаў да алімпіяд павінна быць больш сістэмнай і прадуманай, бо пакуль што яны дэманструюць горшыя вынікі, чым школьнікі з Беларусі, — заявіў на прэс-канферэнцыі, прысвечанай заключнаму этапу алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства», прафесар Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта Генадзь Меркін. — Такой мэтанакіраванай работы ў расійскіх школах, на жаль, няма. І гэта адбіваецца на выніках: беларускія дэлегацыі займаюць на алімпіядзе на парадак больш прызавых месцаў».

«Алімпіяда школьнікаў «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства» праводзіцца штогод, пачынаючы з 2007 года. Двойчы яе прымалі Гомель і Смаленск, адзін раз — Полацк. Сёлета заключны этап алімпіяды праходзіў у Маскве. І пакалькі мерапрыемства было прысвечана 200-годдзю Барадзінскай бітвы, то для ўсіх удзельнікаў алімпіяды была арганізавана экскурсія ў вёску Барадзіно, дзе размешчаны ваенна-гістарычны музей-запаведнік «Барадзінскае поле».

Усяго ўдзел у алімпіядзе ўзялі 8 беларускіх каманд (з кожнай вобласці, Мінска і асобная каманда з Ліцэя БДУ) і 21 каманда з Расіі (19 каманд з рэгіёнаў, а таксама з Масквы і Санкт-Пецярбурга). Кожная каманда складалася з шасці чалавек. Такім чынам, у «фінале» сустрэліся каля 170 старшакласнікаў. Заключны этап алімпіяды складаўся з двух тураў — асноўнага і творчага. Асноўны тур — абавязковы для ўсіх удзельнікаў алімпіяды. Падчас гэтага тура школьнікі выконвалі пісьмовыя заданні: пісалі сачыненне па літаратуры і комплексную работу па рускай мове і літаратуры. Ахвотныя маглі прыняць удзел яшчэ і ў творчым туры, дзе вызначаліся пераможцы ў рытарычным майстэрстве, выразным літаратурным чытанні, а таксама знаўцы гісторыі. Па выніках алімпіяды былі вызначаны 14 лаўрэатаў першай ступені, 22 лаўрэаты другой ступені і 36 лаўрэатаў трэцяй ступені, якія разам з дыпломамі атрымалі і каштоўныя прызы: нэтбукі, смартфоны і электронныя кнігі.

Абсалютнай пераможцай алімпіяды «Беларусь—Расія: гістарычная і духоўная еднасць» стала навучэнка гомельскай гімназіі № 14 Вольга Нянашава, якая набрала максімальную колькасць балаў, значна апярэдзіўшы ўсіх удзельнікаў. Дзяўчына атрымала прыз Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы. У камандным заліку беларускія школьнікі таксама аказаліся першымі. Так, першае месца падзялілі між сабой каманды Гомельскай вобласці і Ліцэя БДУ. На другім месцы аказаліся каманды Мінска і Варонежскай вобласці, а трэцяе месца падзялілі каманды Магілёўскай і Яраслаўскай абласцей. Усяго беларусы прывезлі з Масквы 36 дыпломаў: 10 дыпломаў першай ступені, 12 дыпломаў — другой ступені і 14 дыпломаў трэцяй ступені.

Беларускія школьнікі, якія перамаглі на алімпіядзе, атрымалі права прыярытэтнага паступлення на філалагічныя спецыяльнасці ў расійскія і беларускія ВНУ, а расійскія школьнікі будуць прадстаўлены Міністэрствам адукацыі і навукі да прысуджэння прэмій, заснаваных прэзідэнтам Расіі для таленавітай і адоранай моладзі.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

ВЫГАРАЎ ВАГОН-ТЭРМАС

Увечары каля тэрыторыі рэфрыжэратарнага вагоннага дэпо чыгуначнай станцыі Маладзечна адбыўся пажар: у аднапавярховым цагляным будынку загарэўся вагон-тэрмас.

— У выніку вагон-тэрмас, які належыць расійскай гандлёвай транспартнай кампаніі, выгараў знутры. Вагонарамонтны цэх не пацярпеў, — паведамілі ў цэнтры прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС. — Было ўстаноўлена, што з пачатку кастрычніка вагон знаходзіўся на рамонце. Напярэдадні здарэння брыгадай вагонарамонтнага цэха праводзіліся зварачныя работы. Да прыбыцця нашых падраздзяленняў пажар не тушыўся, два чалавекі, якія былі ў дэпо на момант здарэння, самастойна пакінулі будынак. Прычына пажару і матэрыяльны ўрон высвятляюцца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЯК ВЫКАРАНІЦЬ П'ЯНСТВА ЗА РУЛЁМ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Таксама Генпракуратура прапаноўвае ў 3 разы павялічыць штраф па арт. 18.16 КаАП і ўстанавіць яго ў памеры ад 50 да 100 базавых велічынь з пазбаўленнем права кіравання на 3 гады. Прапрацоўваюцца прапановы і аб увядзенні прэміравання вадзіцеляў за інфармаванне праваахоўных органаў аб кіроўцах, якія селі за руль у нецвярозым стане, аб укараненні сістэмы выкарыстання алказамкоў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Юрый КРАСНОЎ, выкладчык кафедры тактыка-спецыяльнай падрыхтоўкі Акадэміі МУС Беларусі:

«Кіроўцы ў стане лёгкага ап'янення едуць больш уважліва»

— Падыход да пакарання павінен быць дыферэнцыраваны ў залежнасці ад праміле. Напрыклад, тыя, хто сеў за руль пасля «ўчарашняга», у крыві якіх алкаголю да 0,6 праміле, водзяць машыну значна больш уважліва, чым асобныя цвярозыя кіроўцы. Яны спраўна выконваюць ПДР, толькі каб іх не заўважылі. Небяспеку ўяўляюць тыя кіроўцы, якія выпілі і тут жа селі за руль, у крыві якіх больш за 1 праміле алкаголю, якія дрэнна стаяць на нагах. Яны нават не ўяўляюць, якую пагрозу нясуць грамадству, і на той момант ім пляваць на пакаранне. Многія садзяцца за руль «падшафэ», спадзеючыся, што менавіта іх не зловяць. Кіроўца не павінен думаць, што калі яго спыняць, то ён зможа дамовіцца. Павінна быць няўхільнасць пакарання. На Захадзе кіроўца — сябар паліцэйскага, а ў нас — наадварот. Там, калі заўважаць, што хтосьці кіруе ў нецвярозым стане, адразу тэлефануюць у паліцыю. А ў нас ніколі не паведамяць. У нас, калі кіроўцу пазбаўляюць правоў, яго шкадуюць: маўляў, «як жа табе не пашанцавала, што цябе злавілі п'янага за рулём». Я згодны, што канфіскацыя аўтамабіляў будзе садзейнічаць змяншэнню колькасці людзей, якія сядуць за руль у нецвярозым стане. Але не ўсіх...

А ЯК У РАСІІ?

Яраслаў НІЛАЎ, дэпутат Дзярждумы Расіі фракцыі ЛДПР, старшыня Камітэта па справах грамадскіх аб'яднанняў і рэлігійных арганізацый, аўтар шэрагу законапраектаў у вобласці забеспячэння бяспекі дарожнага руху:

«Трэба падціснуць чалавека з усіх бакоў, каб ён не садзіўся п'яным за руль»

— Сёння тэма пакарання п'яных кіроўцаў вельмі актуальная, пакалькі пакаранне па дзейным заканадаўстве дастаткова мяккае (сёння, па рашэнні суда, кіроўца, які збіў да смерці людзей на вуліцы Масквы, атрымае ўсяго 9 гадоў). Мы ўнеслі праект закона, які пагаршае пакаранне за п'яную язду. Прапанавалі ўзняць мінімальную і максімальную планку за ДТЗ са смяротным зыходам. За аднаго загінулага — ад 5 да 9 гадоў, за 2-х — ад 5 да 15 гадоў пазбаўлення волі. Таксама прапанавалі шэраг мер па прафілактыцы п'янай язды. Нейкім чынам вылучаць такіх людзей, рабіць спецыяльныя адтуліны ў пасведчаннях кіроўцы, калі чалавек папаўся за п'яную язду, абсталёўваць машыны алкатэстарамі. Аднаразовыя алкатэстары павінны быць, як у Еўропе — паўсюль: на запраўках, у аптэках, крамах, каб кожны мог яго купіць. Выкарыстоўваць спецметады па «ўдзёўбванні» ў галаву чалавеку, што п'яны за рулём — гэта злачынца, а пасажыр — саўдзельнік злачынства. Трэба забараніць продаж алкаголю на аўтазапраўках. Калі чалавек трапіўся за п'яную язду, трэба пазбаўляць ліцэнзіі на зброю. Трэба падціснуць чалавека з усіх бакоў, каб ён не садзіўся п'яным за руль, каб яму гэта было нявыгадна. Чалавек, які толькі атрымаў правы, павінен быць пад асаблівым кантролем. Мы таксама ўнеслі законапраект, каб канфіскоўваць транспартны сродак — як сродак здзяйснення злачынства. Многія кажуць, што гэта парушэнне правоў уласніка. А як жа правы людзей, якія становяцца інвалідамі па іх віне? Уласнік, што дае машыну дурню, які нападпітку садзіцца і пазбаўляе жыцця ці робіць інвалідамі іншых людзей, няхай таксама ходзіць пешшу ці ездзіць на конях. А транспартны сродак будзе ліквідаваны, і грошы пойдуць у фонд дзяржавы.

Сярэдні памер штрафу за кіраванне транспартным сродкам нападпітку ў Беларусі сёння складае каля 250 базавых велічынь (максімальны памер — 1000 базавых велічынь).

Даведка

Выкарыстанне алказамкоў прымяняецца ў шэрагу еўрапейскіх краін і ЗША. Яно прадугледжвае неабходнасць абсталявання абвінавачанымі ў п'янстве кіроўцамі ў сваіх аўтамабілях алказамкоў, якія не дазваляюць завесці матор, пакуль кіроўца не падзьме ў спецыяльную трубачку і дэтэктар алкаголю не пакажа, што ён цвярозы. Такую аперацыю трэба паўтарыць на працягу першых 15 хвілін шляху, а затым прыкладна два разы на гадзіну. Калі своечасова не падзьмуць, машына сама ўключае аварыйную сігналізацыю і глушыць рухавік.

Пры гэтым кіроўцы павінны самі аплачваць устаноўку блакатара. У выпадку адмовы ад яго ўсталёўкі яны пазбаўляюцца права кіравання аўтамабілем. Жорсткія санкцыі прадугледжаны таксама для тых кіроўцаў, якія пасля ўскладання на іх абавязкаў па ўсталёўцы алказамка будуць кіраваць іншым аўтамабілем у нецвярозым стане альбо здымуць ці адключаць блакатар. Паводле звестак Нацыянальнай адміністрацыі па транспарце і бяспекі дарожнага руху ЗША, выкарыстанне сістэм алказамкоў у 8 разоў скараціла выпадкі паўторнага затрымання вадзіцеляў у стане алкагольнага ап'янення.

Як чакаецца, законапраект, які прадугледжвае ў тым ліку і канфіскацыю аўтамабіля, будзе прыняты ўжо ў першым паўгоддзі наступнага года.

Надзея ДРЫЛА.

«ГРУЗАВЫЯ ПЕРАВОЗКІ СКЛАДАЮЦЬ АМАЛЬ 90 ПРАЦЭНТАЎ ПРЫБЫТКУ АЙЧЫННАЙ ЧЫГУНКІ»

На чыгуначнай станцыі Ждановічы прэзентавалі грузавы электравоз БКГ1, выраблены спецыяльна для Беларусі ў Кітаі.

— Дзяржаўнай праграмай развіцця чыгуначнага транспарту да 2015 года прадугледжана набыццё 30 лакаматываў грузавога руху, — кажа начальнік Беларускай чыгункі Уладзімір Марозаў. — Варта памятаць, што грузавыя перавозкі складаюць амаль 90 працэнтаў нашага прыбытку. На жаль, беларускі парк грузавых лакаматываў зношваецца. Апошні электравоз мы набылі ў 1992 годзе. Менавіта таму мы і ідзём на абнаўленне рухомага саставу. Пралічваючы рост грузаперавозак, да 2020 года мы плануем набыць не менш за 50 электравозаў. Акцэнт робім менавіта на электравозах. У першую чаргу з-за эканамічнасці. Да таго ж эксплуатацыя электравозаў на 20 працэнтаў больш выгадная.

Новы электравоз ужо паспеў пацвердзіць сваю надзейнасць, эканамічнасць і эфектыўнасць: два цягнікі БКГ1 уведзены ў пад-

кантрольную эксплуатацыю беларускай чыгункі. Усяго ў Беларусь будзе пастаўлена 12 такіх электравозаў агульным коштам 99,8 млн долараў. 4 з іх павінны прыбыць да канца лістапада і 6 электравозаў — у 2013 годзе.

— Важнай перадумовай для пакупкі падобных электрацягнікоў з'яўляецца будаўніцтва ў Беларусі атамнай электрастанцыі і электрыфікацыя чыгуначных ліній. Гэта дазволіць павялічыць транзітную прывабнасць Беларусі, — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Калінін. На прэзентацыі кітайскі бок прадстаўляў Цзян Яапін, намеснік міністра камерцыі КНР.

Зручнае крэсла, кандыцыянер, нават «круіз-кантроль» — новы цягнік абсталяваны ўсімі сучаснымі сродкамі камфорту. «Кабіна вельмі ціхая. Цягнік значна адрозніваецца ад нашых старых электравозаў. Гэта датычыцца і кіравання. Тут прадумана ўсё да дэталяў — нават чайнік і мікрахвалёўка ёсць. Умовы практычна ідэальныя», — падзяліўся ўражаннямі машыніст-інструктар дэпо Баранавічаў Міхаіл Каваль.

Надзея БУЖАН. Фота аўтара.

ВЫСОКІЯ ВЫНІКІ АЙЧЫННЫХ СПАРТСМЕНАЎ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што гэта кадравае рашэнне прадыктавана часам і выклікана неабходнасцю вырашэння шэрагу маштабных задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы перад спартыўнай галіной. Сярод іх стратэгічная — кардынальны перагляд падыходаў да падрыхтоўкі спартсменаў і функцыянавання спорту вышэйшых дасягненняў у нашай краіне. Для яе выканання давядзецца нямала папацець, вылучыць сістэмныя прычыны, якія перашкаджаюць развіццю галіны, вызначыць галоўныя мэты, прычым у самыя сціслыя тэрміны. Галоўнае патрабаванне кіраўніка дзяржавы — кардынальна палепшыць усю сістэму функцыянавання спартыўнай галіны. Адбіраць перспектыўных, таленавітых хлопчыкаў і дзяўчынак трэба ўжо ў дзіцячых садах і даводзіць маладых спартсменаў да самага высокага міжнароднага ўзроўню. Пры гэтым зімовая Алімпіяда-2014 у Сочы з'яўляецца важным, але толькі першым своеасаблівым залікам. У далейшым дынаміка развіцця беларускага спорту павінна быць дадатнай, а вынікі высокімі, сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Новы кіраўнік Мінспорту падзякаваў за давер і адзначыў, што часу на разварушванне няма, трэба пачаць работу цяпер і пастарацца ў самыя кароткія тэрміны выканаць задачы, пастаўленыя перад беларускім спортам кіраўніком дзяржавы. Аляксандр Шамко падкрэсліў, што ён бачыць вялікі патэнцыял Міністэрства спорту і турызму, яго супрацоўнікам пад сілу справіцца з існуючымі немалымі праблемамі. Ён лічыць, што ўсе праблемы трэба вырашаць комплексна, каб ні адно пытанне не «правісала». У самы бліжэйшы час будуць дакладна вызначаны галоўныя напрамкі і планы вырашэння задач, якія стаяць перад галіной. Што датычыцца стылю і метадаў работы, то Аляксандр Шамко адзначыў, што ён не мае намеру выкарыстоўваць «сілавыя» метады, але збіраецца прыўнесці ў спартыўнае ведамства высокую адказнасць, дысцыпліну, парадак і дакладнасць выканання даручэнняў у кароткія тэрміны.

Новы міністр на аматарскім узроўні захапляецца плаваннем, веласпортам, асвоіў горныя лыжы.

Папярэднік Аляксандра Шамко на пасадзе міністра Алег Качан 28 кастрычніка быў вызвалены ад пасады ў сувязі з няўдачным выступленнем беларускіх спартсменаў на XXX летніх Алімпійскіх гульнях у Лондане. На Алімпіядзе-2012 беларускія атлеты заваявалі 12 медалёў — два залатыя, па пяць сярэбраных і бронзавых. Гэта горшы вынік за ўсе выступленні беларусаў самастойнай камандай на Алімпійскіх гульнях. На лонданскіх Гульнях перад алімпійцамі Беларусі стаяла задача заваяваць 25 узнагарод.

■ IT-сфера

НАВУЧАННЕ — У БЕЛАРУСІ, СТАЖЫРОЎКА — У ЗША

Каб па заканчэнні навучальнай установы быць паспяховым і канкурэнтаздольным на рынку працы, адной тэарэтычнай падрыхтоўкі недастаткова. Такой думкі прытрымліваюцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі, дзе днямі адкрыўся міжнародны навуковы цэнтр «Android Software Center».

Партнёрам БДУІРа па рэалізацыі праекта выступіла Ілінойская тэхналагічная асацыяцыя (ЗША, Чыкага). Цэнтр, створаны на базе кафедры радыёэлектронных сродкаў і абсталяваны навейшымі камп'ютарамі, мае неабходнае праграмнае забеспячэнне. На яго базе студэнты і супрацоўнікі БДУІРа будуць спасцігаць асновы аперацыйнай сістэмы Android.

— За апошнія гады на базе нашага ўніверсітэта створана ўжо каля трыццаці сумесных вучэбна-навуковых цэнтраў і лабараторый, — расказаў рэктар БДУІР Міхаіл Батура. — Усе яны працуюць пры падтрымцы буйных кампаній. Ідэя гэтага праекта ўзнікла яшчэ год таму, калі мы адкрывалі цэнтр відэаканферэнцсувязі. У гэты час у Мінску знаходзіўся і прэзідэнт кампаніі FORTE Knowledge Стыў Крэйнін, які прапанаваў нам цікавае супрацоўніцтва.

Першая лекцыя ў навуковым цэнтры прайшла ўжо 3 кастрычніка. Для ўдзелу ў эксперыментальным курсе былі адабраны 75 слухачоў. Лабараторыя разлічана на 25 чалавек, таму заняткі праходзяць тры разы на тыдзень.

Лепшыя студэнты з курса змогуць прайсці стажыроўку не толькі ў кампаніі FORTE, але і ў іншых, якія ёй падпарадкоўваюцца. А такіх кампаній — каля 700. Апошнія будуць знаёміцца з універсітэтам, што дазволіць задзейнічаць новых інвестараў і рэалізаваць шэраг новых праектаў у сферы сацыяльных сетак і фінансавых структур, а таксама стварыць добрую праграмную базу, якая будзе карыстацца попытам на рынку тэхналогій.

Пакуль што выкладанне ва ўніверсітэце вядзецца супрацоўнікамі кампаніі FORTE Knowledge пры дапамозе відэаканферэнцсувязі. Заняткі будуць доўжыцца да мая 2013 года. А ў верасні наступнага года навучанне на курсе пачнецца ўжо з іншымі студэнтамі. Ахвотныя стаць удзельнікам праграмы будуць здаваць уступны экзамен.

Пасля заканчэння курса будуць выдавацца сертыфікаты Ілінойскай тэхналагічнай асацыяцыі (ITA), якія будуць сведчаннем гатоўнасці чалавека працаваць у карпаратыўнай структуры з праграмай Android. Але каб атрымаць такі сертыфікат, трэба будзе здаць тэст па пройдзенай праграме.

Трэба дадаць, што магчымасць навучацца ў міжнародным цэнтры будзе і ў студэнтаў іншых тэхнічных ВНУ, але перавага ўсё ж такі будзе на баку студэнтаў БДУІРа.

Алена ДРАПКО. Фота з архіва прэс-службы БДУІР.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

07.12.2012 г. в 10.00 в здании СКИДЕЛЬСКОГО ГОРОДСКОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА (г. Скидель, ул. Ленина, 45) состоится аукцион продажи в частную собственность земельных участков

Номер лота	Кадастровый номер и адрес земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Вид вещного права	Начальная цена предмета аукциона, руб.	Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, руб.*	Инфраструктура и условия инженерного развития земельных участков
1	**422050400002002474, Республика Беларусь, Гродненская область, Гродненский район, г. Скидель, ул. Горовца, участок № 4 (по генплану).**	**0,1457**	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	Частная собственность	**23 000 000**	7 643 220	Инженерные сети: газоснабжение; водоснабжение; электроснабжение; электросвязь.
2	**422050400001000748, Республика Беларусь, Гродненская область, Гродненский район, г. Скидель, ул. Садовая, участок № 15 (по генплану).**	**0,1267**	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	Частная собственность	**25 774 961**	1 054 780	Инженерные сети: газоснабжение; водоснабжение; водоотведение; электроснабжение; электросвязь.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) со дня опубликования настоящего извещения и **до 17.00 03.12.2012 г.** представляет в комиссию по организации и проведению аукциона на право заключения договора аренды и продажи в частную собственность земельных участков по адресу: **г. Скидель, ул. Ленина, 45, кабинет 1**, документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в частную собственность по результатам аукциона;

заверенную копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10% от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет Скидельского горисполкома, филиал № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» код банка 752 № 3600514120189, УНН 500045119 назначение платежа 04901 – продажа в частную собственность;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина – нотариально удостоверенную доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан и уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанный в извещении срок соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в настоящем извещении.

Осмотр земельных участков осуществляется претендентами на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное рабочее время в течение установленного срока приема заявлений.

Контактные телефоны: 974-071, 975-056, 975-241.

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Аукцион проводится в порядке, определённом Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

Шаг аукциона – 5% от предыдущей цены, называемой аукционистом.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

УВАГА, СІГ!

Згодна з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, у краіне ўведзена забарона на лоўлю чудскага сіга — з 1 лістапада па 15 снежня.

— Яна ўведзена ў мэтах захавання рыбных рэсурсаў і стварэння спрыяльных умоў для рэпрадуктавання рыбы, — сказаў старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету Вадзім Варабей.

Згодна з артыкулам 15.35 Кодэкса Рэспублікі Беларусь «Аб адміністрацыйных правапарушэннях», за здабычу рыбы ў забаронены час прадугледжаны штраф у памеры ад 10 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй прылад здабычы рыбы і іншых прадметаў, якія з'явіліся прыладай ці сродкам здзяйснення парушэння.

«ЗНЯЎ» ГЛЕБЫ НА 500 МІЛЬЁНАЎ

Пракуратуры Асіповіцкага раёна належыць даць прававую ацэнку дзеянням 43-гадовага мінчаніна і вырашыць пытанне яго крымінальнай адказнасці за... пашкоджанне зямель.

— Устаноўлена, што з пачатку года па канец верасня гэты грамадзянін пры будаўніцтве прыватнага дома ў адной з вёсак Асіповіцкага раёна, выкарыстоўваючы цяжкую землярыйную тэхніку, незаконна зняў урадлівы слой глебы і наглебавага дзёрану на плошчы больш за 280 квадратных метраў. Гаворка ідзе пра ўчастак прыбярэжнай паласы ракі Свіслач, які прылягае да межаў домаўладання, — распавялі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. — Адпаведнае ўзгадненне з органамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя не праводзілася. Такім чынам, навакольнаму асяроддзю была нанесена шкода ў памеры 500 мільёнаў рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БУДАВАЛІ З БРАКАМ... ВІНАВАТЫХ НЯМА?

У пяціпавярховым цагляным доме ў Пінску абрынулася лесвічная бэлька. Апорная канструкцыя лесвічнага марша паміж трэцім і чацвёртым паверхамі ў пятым пад'ездзе абвалілася ў суботу вечарам. На вялікае шчасце, у гэты момант пад злашчаснай бэлькай нікога не было. Таму ніхто і не пацярпеў.

Спецыялісты назвалі папярэднюю прычыну абвалу — вытворчы брак. Дом быў пабудаваны ў 1970 годзе. На лесвіцу выкарысталі менш, чым трэба, арматуры. Зараз ліквідацыяй наступстваў займаецца служба ЖКГ. Спачатку пашкоджаны элемент замянілі на часовы, а праз колькі дзён распачнецца паўнацэнны рамонт.

Яна СВЕТАВА.

■ Гэта мы, Госпадзі!

СЦІЗОРЫКАМ — У СЭРЦА

Дзікунская гісторыя здарылася ў сталіцы. 25-гадовы маладзён патрапіў у бальніцу з нажавым раненнем грудной клеткі з пашкоджаннем сэрца і лёгкага. Стан яго ацэньваецца як крайне цяжкі...

А пачалася гісторыя з таго, што хлопцы бавілі час за бутэлькай у кватэры аднаго з іх. Калі алкаголь скончыўся, пайшлі па дабаўку у краму па вуліцы Каліноўскага. Адзін з маладзёнаў застаўся чакаць таварыша на вуліцы. Калі пакупнік двух літраў джынтоніка выйшаў з крамы, убачыў, што таго збівае незнаёмец. Кінуўся сябру на дапамогу, але не паспеў: зламыснік ударыў таго нажом і збег.

— Падазроны ва ўчыненні злачынства быў затрыманы ўжо праз гадзіну, — расказала прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г. Мінска Вольга Куцько. — Ім аказаўся 46-гадовы мужчына без пэўнага месца жыхарства, які раней ужо быў судзімы за разбой. Міліцыянеры канфіскавалі ў яго сцізорык. Будучы добра нападпітку, падазроны дакладна патлумачыць прычыну раптоўнай сваркі з незнаёмым чалавекам не змог...

Сяргей РАСОЛЬКА

■

НА ФОТА Ў ЯГО НЮХ!

Гэтага «майстра» ў прамым сэнсе слоў ногі кормяць

Калматы і хвастаты фатограф па мянушцы Федзя траціць ганарары на мяса, у сацыяльнай сетцы дадае па 300 сяброў за раз і, магчыма, будзе здымаць вяселле сяброўкі сваёй гаспадыні.

Гаворка ідзе не пра якога-небудзь фатографа, у якога раптам «калматасць павысілася» і вырас хвост, а пра сапраўднага сабачку, які жыве са сваёй гаспадыняй, фатографам Ксеніяй Авімавай, у Мінску, у гарадской кватэры. Першы зроблены Федзем фотарэпартаж з'явіўся ў сеціве яшчэ напрыканцы лета, гэтак жа, як і першыя публікацыі і відэасюжэты ў СМІ, якія распавядалі сенсацыйную навіну пра сабаку-фотографа. Як далей развіваецца Федзева «кар'ера», вырашылі пацікавіцца карэспандэнты «Звязды».

...Побач з домам, у якім жывуць Федзя і Ксенія, — глыбокі круты яр, дзе Федзя-Дэні (такое у яго другое імя) звычайна гуляе. Яр выдатны на сабачы густ, а вось спускацца туды па першым снезе дзвюм нязвыклым да ўлюбёных сабачых месцаў дзяўчатам, якімі аказаліся мы з фотакарам, падалося суперэкстрэмальнай прыгодай.

Ксенія ж спусцілася лёгка, без страху і дастала з кішэні Федзеву камеру. Серабрыстага колеру фотаапарат, формай і памерам крыху падобны да маленькага пакета соку, прымацоўваецца да ашыйніка і робіць здымак кожныя пяць секунд.

— Цяпер я купіла камеру спецыяльна для сабакі, сама такой не карыстаюся. Першы раз, калі Федзя «спрабаваў» сябе ў якасці фатографа, фотаапарат узялі напракат, — расказвае Ксенія.

Такую тэхніку звычайна бяруць з сабой прыхільнікі экстрэмальнага спорту, калі ў гарах ці падчас скачка з парашутам няма магчымасці трымаць у руках фотакамеру, а здымкаў вельмі хочацца. Каштуе камера каля 500 долараў.

...Мы размаўляем, а Федзя бегае побач, хавае нос у снег, круціцца вакол хмызнякоў і адначасова ладзіць нам і сваёй гаспадыні фотасесію. Камера ўсё яшчэ на ашыйніку. Ксенія толькі перыядычна выцірае снег, які ліпне да аб'ектыва. Дарэчы, гадаванец Ксеніі сваю справу паважае і бясплатна не працуе.

— Першы ганарар ён атрымаў за здымкі аднаго мерапрыемства, якое ладзілася летам на вольным паветры. У арганізатараў з'явілася ідэя знайсці сабаку, павесіць на яго камеру і пусціць, каб бегаў. Федзя і пазаскочыла на рукі да гаспадара, як толькі Федзя падбег блізка.

Мінскага сабаку-фотографа пакуль не напаткала слава крыху падзабытага васьмінога Паўля ці сталічнай вавёркі-таксіста Масіка. Гэтых «медыйных персон» запрашалі цягнуць жэрабя на верагодныя вынікі футбольных матчаў. Але затое ў Федзі 660 сяброў у сацыяльнай сетцы «Фэйсбук». І яны пастаянна дадаюцца.

Першы ганарар ён атрымаў за здымкі аднаго мерапрыемства, якое ладзілася летам на вольным паветры. У арганізатараў з'явілася ідэя знайсці сабаку, павесіць на яго камеру і пусціць, каб бегаў. Федзя і паздымаў.

Сабачыя работы апублікавалі на адным з інтэрнэт-парталаў, а на зароблены ганарар гаспадыня набыла для Федзі смакаты — мяса і гародніну.

Увогуле, за той невялікі прамежак часу, пакуль доўжылася прагулка, давялося зразумець, што характар у Федзі сапраўды мужчынскі: сабака цікаўны, жвавы, на незнаёмых людзей без прычыны не брэша, але не надта дае сябе пагладзіць, не разменьваецца на сантыменты, аддае перавагу рашучым дзеянням. Адна яго калматая сяброўка, якую таксама ў гэты час вывелі на прагулку, з неверагодным спрытам

На старонцы перыядычна з'яўляюцца новыя здымкі. Статуты раскажуць, напрыклад, пра тое, як Федзя хаваецца ад гаспадыні ці радуецца першаму снегу. У Ксеніі свой погляд на верагодную будучую папулярнасць гадаванца.

— Я, безумоўна, разумею, што людзям здымкі Федзі цікавыя перш за ўсё таму, што ён сабака. Маўляў, якая «сімпампуська», а яшчэ і фатаграфуе

— Калі па тэлебачанні паказалі сюжэт пра Федзю, у гэты ж дзень «пасябраваць» з ім захацелі ажно 300 чалавек. Прычым большасць з іх — незнаёмыя людзі. Акрамя таго, многія жывуць за мяжой, — расказвае Ксенія.

нешта. Толькі здараецца, некаторыя фота мяне, як прафесіянала, сапраўды здзіўляюць. Вядома, я ведаю, як зняць, каб атрымалася тое ж самае. Але ж Федзіны добрыя фота — гэта абсалютная нечаканасць. Тым яны і каштоўныя. Калі так здарыцца, што людзі, якія не цікавяцца фотажурналістыкай і не бачылі маіх работ, будуць ведаць мяне менавіта як гаспадыню сабакі-фотографа, думаю, крыўдаваць не стану, — дзеліцца гаспадыня.

...Удалося даведацца і пра верагодны наступны заказ, які належыць выканаць фотографу Федзі. Сяброўка Ксеніі думае запрасіць Федзю паздымаць вяселле. Справа толькі за жаніхом, які найперш павінен перамагчы страх перад сабакамі. Час да вясны яшчэ ёсць. А пакуль фотограф Федзя згадзіўся змясціць адзін са здымкаў на старонках нашай газеты.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ і «фотографа» ФЕДЗІ.



Санэпідслужбе Гомельшчыны — 90 гадоў

Гомельскі абласны цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, як і шэраг падобных абласных установ, праводзіць сёння шырокі спектр лабараторных даследаванняў па дыягностыцы інфекцыйных і паразітарных захворванняў, даследуе харчовую і нехарчовую прадукцыю, а таксама аб'екты навакольнага асяроддзя, паветра, ваду, глебу і г.д. Дарэчы, адкрыццё Гомельскай санітарнай станцыі імя 5-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі было першым адкрыццём комплекснай санітарна-эпідэміялагічнай установы на тэрыторыі СССР.

Як паведамляюць у лабараторным аддзеле цэнтра, сучаснае аналітычнае абсталяванне сёння дазваляе ідэнтыфікаваць у 2-дзённы тэрмін 425 мікраарганізмаў, вызначыць іх адчувальнасць больш як да 50 антыбактэрыяльных прэпаратаў. Харчовая сыравіна і харчовыя прадукты даследуюцца па 294 паказчыках, нехарчовыя — па 116, водаправодная вада — па 85, паветра працоўнай зоны, закрытых памяшканняў — па 242, глеба — па 30. Дыягнастычныя даследаванні выконваюцца па 109 наазаформах інфекцыйных і паразітарных захворванняў.

Сёлета былі ўведзены 6 тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза па нехарчовай прадукцыі, а ў наступным годзе ўступяць у сілу 7 тэхрэгламентаў па харчовай. Прымяняюцца методыкі па вызначэнні араматызатараў, падсалоджвальнікаў, сінтэтычных фарбавальнікаў, іншых дабавак да харчовай прадукцыі. Ёсць і кліматычная камера, з дапамогай якой можна вызначыць наяўнасць у прадметах мэблі фенольных і фармальдэгідных выпарэнняў у навакольнае асяроддзе.

Цэнтр адзіны ў вобласці ажыццяўляе даследаванні таксікалагічных паказчыкаў парфумерна-касметычнай прадукцыі. Значна пашыраны пералік дыягнастуемых інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам, асвоены методыкі па вызначэнні палавых гармонаў, дыягностыцы сучаснымі метадамі асабліва небяспечных інфекцый — такіх, як халера, бруцэлёз, сібірская язва.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Фармвытворчасць

АЙЧЫННЫЯ ІНСУЛІНАВЫЯ ПРЭПАРАТЫ — У НОВАЙ ФОРМЕ

З 2015 года на рынак краіны паступяць інсулінавыя прэпараты ў картрыджах, вырабленых па поўным тэхналагічным цыкле. Акрамя традыцыйных формаў інсулінаў ва флаконах дзеля забеспячэння хворых на цукровы дыябет высакаякаснымі прэпаратамі інсуліну айчыннай вытворчасці, значнага павышэння якасці жыцця такіх хворых, РУП «Белмедпрэпараты» плануе выраб гэтых лекаў і ў картрыджнай форме. На першым этапе, ужо ў бліжэйшыя гады, на фармрынак будуць пастаўлены інсуліны Актрапід НМ Пенфіл 100 МЕ/мл і Пратафан НМ Пенфіл 100 МЕ/мл у картрыджах у форме in bulk, паведамляе начальнік аддзела біялагічных іспытаў упраўлення інавацыйнага развіцця РУП «Белмедпрэпараты» Міністэрства аховы здароўя Беларусі Алена ЛІТВІНАВА.

Адзінае ў нашай краіне прадпрыемства, якое шмат гадоў вырабляе прэпараты з выкарыстаннем біятэхналагічных працэсаў, — РУП «Белмедпрэпараты». Размова ідзе пра выпуск антыбіётыкаў, некаторых вытворных для вытворчасці кровазаменнікаў, шэраг прадуктаў біягеннага паходжання (інсуліны, гепарын і інш.). Прадпрыемства з'яўляецца адзіным у краіне вытворцам гатовых лекавых формаў генна-інжынернага інсуліну.

Прадпрыемства працуе над стварэннем прэпаратаў на аснове аналагаў інсуліну. Плануецца правядзенне клінічных іспытаў такіх лекавых сродкаў, як Гларгін (аналаг прэпарата Лантус вытворчасці «Санофі Авенціс», Францыя) і Ліспро (аналаг прэпарата Хумалог вытворчасці «Элі Лілі», ЗША).

З Цэнтрам малекулярнай біялогіі і імуналогіі Рэспублікі Куба было заключана пагадненне аб перадачы тэхналогій для рэгістрацыі ў нас лекавых сродкаў Эрытрапаэцін і Філграсцім пад гандлёвымі маркамі Эпацым і Лейкацым. Эрытрапаэцін стымулюе ўтварэнне эрытрацытаў, прызначаны для прафілактыкі і лячэння анемій рознага паходжання, у тым ліку ў хворых на лейкоз, з пухлінамі, лячэнне якіх патрабуе хіміятэрапіі. Філграсцім прызначаны для лячэння прыроджанай і злаякаснай нейтрапеніі, а таксама зніжэння частаты ўзнікнення нейтрапеніі ў анкахворых, якія атрымліваюць хіміятэрапію.

Сёння ў Міністэрстве аховы здароўя зарэгістраваны тры лекавыя формы Эрытрапаэціну і адзін прэпарат Філграсціму ў форме in bulk. Пастаўка прэпаратаў плануецца налета. У перспектыве будуць асвойвацца некалькі біятэхналагічных прадуктаў па імпартазамяшчэнні.

— Аднак у Беларусі адсутнічаюць уласныя тэхналогіі вытворчасці падобных прэпаратаў — як на стадыі сінтэзу субстанцый, так і на стадыі атрымання гатовых лекавых формаў, — кажа Алена Літвінава. — А шэраг распрацаваных і ўкаранёных буйнымі сусветнымі цэнтрамі генна-інжынерных тэхналогій знаходзяцца пад патэнтнай абаронай. Таму дзеля распрацоўкі і вытворчасці біятэхналагічных прадуктаў прадпрыемства шукае партнёраў сярод замежных вядучых фармацэўтычных кампаній — для трансферу тэхналогій і набыцця ліцэнзій на вытворчасць. Кошт такіх ліцэнзій у залежнасці ад значнасці прэпарата і яго навізны дасягае 1-5 і больш млн долараў. Такім чынам, для рэспублікі досыць актуальным застаецца пытанне арганізацыі ўласнай вытворчасці субстанцый біятэхналагічнай прадукцыі з выкарыстаннем генна-інжынерных метадаў...

Святлана БАРЫСЕНКА

■ Пытальнік

ЧЫМ НЕБЯСПЕЧНАЯ РТУЦЬ?

Прывітанне, рэдакцыя газеты «Звязда». Вельмі часта ў рубрыцы «Здарэнні» пішуць пра ртуць. Хацелася б даведацца, чым яна небяспечная для здароўя чалавека? У дзяцінстве мы гулялі з шарыкамі ртуці, бралі іх у рот, і нічога не адбывалася. Хачу даведацца меркаванне спецыяліста па гэтым пытанні.

Анатоль Іванавіч СУДЗІБОР,
вёска Зялёны Мох Мазырскага раёна.

Ртуць, яе арганічныя і неарганічныя злучэнні, валодаюць вельмі высокай таксічнасцю і, згодна з сучаснай класіфікацыяй шкодных рэчываў і злучэнняў, адносяцца да першага класа небяспекі — іншымі словамі, да рэчываў надзвычай небяспечных. Паводле інтэрнэт-энцыклапедыі, ядавітымі з'яўляюцца толькі пары і растваральныя злучэнні ртуці. Металічная ртуць не аказвае істотнага ўздзеяння на арганізм. Выпарэнне ртуці пачынаецца ўжо пры пакаёвай тэмпературы. Пары яе бескаляровыя і не валодаюць ніякім пахам. Выявіць іх можна толькі пры дапамозе метадаў фізіка-хімічнага аналізу і спецыяльных прыбораў.

Пары ртуці таксічныя для чалавека нават у тым выпадку, калі канцэнтрацыя іх вельмі малая. Ртуць небяспечная тым, што пры атручэнні яе парамі ядавіты метал усмоктваецца ў страўнікавакішачны тракт, назапашваецца ў мозгу і нырках, выклікаючы хранічнае атручэнне ўсяго арганізма. Атручэнні злучэннямі ртуці прыводзяць да цяжкіх паражэнняў цэнтральнай нервовай сістэмы, мышачных расстройстваў, парушэння зроку і слыху і іншым негатыўным наступствам.

У Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях нагадалі асноўныя дзеянні пры выяўленні разлітай ртуці. Калі вы знайшлі невялікую яе колькасць, трэба адразу вывесці з памяшкання дзяцей. Потым неабходна зрабіць наступнае: сабраць бліскучыя кроплі гумавай грушай у шкляны слоік, які шчыльна закрываецца; прамыць месца разліву мыльным растворам; адчыніць вокны для праветрывання. Калі ртуць патрапіла на дыван ці дывановае пакрыццё, для таго, каб яе сабраць, трэба запрасіць спецыяліста.

Для выдалення ртуці можна выкарыстоўваць: поліэтыленавыя пакеты, шчыльныя мяшкі для смецця, гумавыя ці латэксныя пальчаткі, рэспіратар, папяровыя ручнікі ці сурвэткі, кардонку ці скрабок з гумавым кончыкам, гумавую медыцынскую грушу. Абавязкова трэба ўтылізаваць прадметы, якія выкарыстоўваліся падчас вышэйназванай працэдуры.

Пры выяўленні разліву ртуці ў побыце забараняецца выкарыстоўваць пыласос. Калі вы паспрабуеце сабраць ртуць пры яго дапамозе, гэта прывядзе да яшчэ большага распаўсюджвання пароў металу. Калі ўсё ж выкарысталі пыласос, ад яго давядзецца пазбаўляцца, настойваюць спецыялісты. Нельга выкарыстоўваць мяцёлку ці швабру. У гэтым выпадку шарыкі ртуці будуць разбіты на яшчэ больш дробныя часцінкі, якія неймаверна цяжка сабраць. Нельга выкідваць ртуць ва ўнітаз, у пасудамыечныя машыны, паколькі яна можа асесці ў каналізацыйных трубах і працягне аказваць негатыўны ўплыў на здароўе людзей. Дастаць ртуць з каналізацыі вельмі цяжка

■ Ну і ну!

МАНЬЯК ПРЫЗНАЎСЯ Ў НАПАДАХ. А ПАЦЯРПЕЛЫХ... НЯМА

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Фрунзенскага РУУС г. Мінска па падазрэнні ў здзяйсненні гвалтоўных дзеянняў сэксуальнага характару затрымалі раней судзімага 24-гадовага мінчаніна. Падчас вышуковых мерапрыемстваў у аператыўнікаў з'явілася інфармацыя аб дачыненні затрыманага да іншых аналагічных злачынстваў.

Паводле інфармацыі Фрунзенскага РУУС, падчас разбору маладзён расказаў, што з чэрвеня здзейсніў больш за 20 нападаў на дзяўчат. З яго слоў выходзіла, што свае хуліганскія дзеянні ён увасабляў у жыццё ў мікрараёнах Кунцаўшчына, Каменная Горка, Захад, Сухарава. Убачыўшы на вуліцы адзінокую дзяўчыну, зламыснік накіроўваўся следам. Для нападу маладзён выбіраў ціхае месца: пад'езд, ліфт, пустку. Выбраўшы момант, хапаў ахвяру і пачынаў мацаць... Калі дзяўчына пачынала крычаць, супраціўляцца і клікаць на дапамогу, зламыснік збягаў. Толькі аднойчы, паводле яго прызнання, ён зайшоў у сваіх дзеяннях далей, чым «звычайна»: паспрабаваў згвалціць дзяўчыну, якая ад шоку не магла аказаць супраціўлення. На шчасце, з'яўленне позняга мінака перашкодзіла гэтым намерам.

Маладзён расказваў пра свае «подзвігі» даволі падрабязна, спыняючыся на дэталях. Здзіўляе іншае: у міліцыю не паступалі заявы ад пацярпелых, не было ніякай інфармацыі наконт здарэнняў і з іншых крыніц. У гэтай сувязі праваахоўнікі звярнуліся да магчымых ахвяр з просьбай адгукнуцца, інакш у зламысніка ёсць шанцы пазбегнуць адказнасці за ўчыненае. Ён, між іншым, раней ужо двойчы быў судзімы, прычым за злачынствы сэксуальнага характару. Вярнуўся з месцаў «аддаленых» у сакавіку і, паводле прызнання затрыманага, неўзабаве адчуў сэксуальную цягу да незнаёмых дзяўчат, якіх сустракаў на вуліцы. У Фрунзенскім РУУС гарантуюць магчымым ахвярам максімальную карэктнасць і канфідэнцыяльнасць пры правядзенні следчых дзеянняў.

Сяргей РАСОЛЬКА

ЖАНЧЫНУ-КАНТРАЛЁРА ХАЦЕЛІ ЗАДУШЫЦЬ: ДУМАЛІ, ШТО МАХЛЯРКА

Жанчына, кантралёр сістэмы энергазбыту ў Віцебску, прыйшла ў кватэру праверыць паказальнікі электралічыльніка і трапіла ў непрыемную гісторыю.

— У кватэру ў доме на праспекце Фрунзэ кантралёр зайшла а пятай гадзіне дня. Дзверы адчыніў мужчына, які паводле яе слоў, знаходзіўся ў нецвярозым стане, але ж, так бы мовіць, быў адэкватным. Кантралёр запісала паказальнікі лічыльніка. Мужчына распісаўся ў спецыяльнай кніжцы, а потым папрасіў перааформіць адпаведны дагавор з Віцебскім філіялам энергазбыту на яго імя, бо яго мама, з якой раней быў аформлены такі ж дагавор, памерла, — расказвае **Сяргей МАСЛОЎСКІ, старшы памочнік пракурора Кастрычніцкага раёна г. Віцебска.** — Кантралёр, вядома, не адмовіла. Гаспадар кватэры запрасіў яе прайсці на кухню і па яе просьбе пашукаў неабходныя паперы. У гэты час да жанчыны падышоў таварыш гаспадара жылля і заявіў кантралёру, што яна — махлярка. Маўляў, ходзяць тут па кватэрах розныя, а потым праблемы ў гаспадароў кватэр узнікаюць. Жанчына паказала пасведчанне. Праціла, калі ёсць сумненні, патэлефанаваць яе начальству і пераканацца ў тым, што яна насамрэч працуе кантралёрам. Але на недаверлівага грамадзяніна гэта ніяк не паўплывала...

Як потым расказала кантралёр, ён выцягнуў яе ў прыхожую і пачаў душыць. Гаспадар, калі гэта ўбачыў, замест таго, каб аказаць ёй дапамогу, наадварот пачаў дапамагаць сябру. Пачула жанчына і пагрозы аб тым, што яе трэба павесіць у ваннай. Яна вельмі гучна крычала, праціла адпусціць, сказала, што выхоўвае маленькае дзіця.

Яе крыкі аб дапамозе пачуў сусед гаспадара кватэры і выклікаў міліцыю.

Зладзеяў асудзілі. Гаспадара кватэры, 1972 года нараджэння, і яго таварыша, 1968 года нараджэння, за злоснае хуліганства прыгаварылі да 2 гадоў абмежавання волі з адбываннем пакарання ў папраўчай установе адкрытага тыпу. На карысць пацярпелай у якасці кампенсацыі маральнай шкоды яны абавязаны выплаціць 5 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДАДАТКОВЫЯ НАМАГАННІ СУПРАЦЬ НЕЛЕГАЛАЎ

Мінск наведала дэлегацыя рэгіянальнай антытэрарыстычнай структуры Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. У рэгіянальную структуру ўваходзяць Казахстан, Кітай, Кіргізія, Расія, Таджыкістан і Узбекістан. Арганізацыя скіравана на барацьбу з сепаратызмам, экстрэмізмам, наркатрафікам і нелегальнай міграцыяй.

Як паведамляюць у цэнтры інфармацыі і грамадскіх сувязяў Камітэта дзяржбяспекі Беларусі, вышэйзгаданая арганізацыя і КДБ Беларусі абмеркавалі дзеянні па барацьбе з рознымі праявамі экстрэмізму, пытанні яго фінансавання, у тым ліку за кошт сродкаў, атрыманых ад незаконнага абароту наркотыкаў, зброі і трансгранічнай злачыннасці. Падпісаны пратакол аб супрацоўніцтве.

З пачатку гэтага года нашы праваахоўныя структуры адзначаюць актывізацыю дзейнасці арганізатараў каналаў нелегальнай міграцыі, якія маюць экстрэмісцкую і тэрарыстычную накіраванасць, у краіны Заходняй Еўропы. Беларусь прадпрымае дадатковыя намаганні па павышэнні ефектыўнасці процідзеяння небяспечным выклікам.

Дарэчы, упраўленнем КДБ па Гомельскай вобласці сумесна з УУС Гомельскага аблвыканкама не так даўно спынена злачынная дзейнасць арганізатара канала нелегальнай міграцыі. Ім аказаўся грамадзянін Пакістана, які меў від на жыхарства ў Беларусі. У Гомелі яшчэ летам былі затрыманы трое грамадзян Нігерыі падчас спробы збыту фальшывай валюты. Нігерыйцы сцвярджалі, што прыбылі ў нашу краіну па запрашэнні грамадзяніна Пакістана ў якасці «гандлёвых партнёраў» прыватнага прадпрыемства, дырэктарам якога і з'яўляецца згаданы грамадзянін. Супрацоўнікі КДБ высветлілі, што зарэгістраванае пакістанцам прыватнае ўнітарнае прадпрыемства ніякай фінансава-гаспадарчай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі не ажыццяўляла, аднак спраўна запрашала ў рэспубліку «гандлёвых партнёраў» з розных краін Паўднёва-Усходняй Азіі і Паўночнай Афрыкі. Праз інтэрнэт пакістанец «прымаў заказы» ад ахвотных перабрацца ў Еўрасаюз, затым накіроўваў клієнтам запрашэнні ад імя фірмы. Арганізатар канала распрацаваў і механізм далейшай легалізацыі замежнікаў у Беларусі, а таксама перапраўкі ў Заходнюю Еўропу.

Зараз вырашаецца пытанне аб завядзенні крымінальнай справы ў дачыненні да грамадзяніна Пакістана — за арганізацыю незаконнай міграцыі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Жах!

ЗАМЕСТ ДРОЎ... ЛЮДЗІ

Чвэрць стагоддзя правядзе за кратамі злачынец, які забіў людзей сякерай

Сяргей Трафімаў (прозвішча змянена. — *Аўт.*) пражываў у адным з пасёлкаў Віцебскай вобласці. Доўгі час быў адзін, але неўзабаве знайшоў сужыцельку з агульнымі інтарэсамі — ужыванне спіртных напояў. Разам яны жылі ў Сяргея дома, нідзе не працавалі і злоўжывалі спіртным. Заработкі на жыццё тым, што выконвалі дапаможныя работы ў жыхароў пасёлка: капалі ў агародзе, калолі дровы. Зімой мінулага года, калі ўдарылі маразы, пераехалі да свайго знаёмага. На новым месцы жыхарства ўжо ў большай кампаніі працягвалася злоўжыванне спіртным.

У адзін з дзён лютага гэтага года сусед прапанаваў Сяргею зарабіць: паказалоць дровы. Сяргей пагадзіўся, знайшоў сякеру, паставіў яе каля печы і збіраўся раніцай наступнага дня ісці папрацаваць. Аднак раніцай да сужыцелькі прыйшла сяброўка, ды і гаспадар дома атрымаў заработную плату. У выніку з раніцы ўсе ўчатырох пачалі піць пладова-ягаднае віно. Увечары паміж жанчынамі ўзнік канфлікт адносна таго, каму ўсё ж належыць гаспадар дома і з кім ён будзе жыць.

— Сяргей умяшаўся ў канфлікт: узяў сякеру і нанёс сваёй сужыцельцы больш за пятнаццаць удараў па галаве. Біў з такой сілай, што ў выніку частка костак чэрапа аддзялілася ад галавы. Смерць наступіла на месцы здарэння ад атрыманых траўмаў, — расказвае **Дзмітрый ЛУТАЎ, пракурор аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў па крымінальных справах пракуратуры Віцебскай вобласці.** — Другая жанчына паспрабавала перашкодзіць забойцу, але і ёй Сяргей нанёс каля дваццаці ўдараў сякерай па галаве. З адкрытай чэрапнамазгавой траўмай і шматлікімі сечанымі ранамі галавы і твару жанчына засталася ляжаць на падлозе. На гэтым злачынец не супакоіўся. Ён пайшоў у іншы пакой, дзе знаходзіўся гаспадар дома. Выпіў з ім спіртнога, і... пачаў біць сякерай па галаве. Потым забойца супакоіўся і заснуў.

Прачнуўшыся раніцай, пайшоў з дому. Праз некаторы час у дом зайшоў сусед, каб даведацца, ці зможа сёння Сяргей пакалоць дровы. У доме ён убачыў залітыя крывёй сцены і знайшоў яшчэ жывых гаспадара дома і сяброўку сужыцелькі. У гэты ж дзень жанчына памерла ў бальніцы.

Прысудам калегіі па крымінальных справах Віцебскага абласнога суда злачынец прызнаны вінаватым у забойстве дзвюх асоб, учыненым з асаблівай жорсткасцю.

Забойцу прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 25 гадоў з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Прысуд уступіў у законную сілу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

ДЗЕНЬ ЭКАНОМІКІ ЯК СПОСАБ ПРЫЦЯГНУЦЬ ІНВЕСТЫЦЫІ

У пэўнай ступені новым спосабам весці дзелавы дыялог з замежнымі інвестарамі стаў чарговы Дзень нямецкай эканомікі ў Мінску. У рамках гэтага 6-га па ліку мерапрыемства, прысвечанага зараз ролі малога і сярэдняга бізнэсу ў наладжванні ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, адбылася сустрэча дзелавых колаў Беларусі і Германіі.

Сігналы ўзаемнага даверу

Чым нам можа быць карысным досвед развіцця малога і сярэдняга бізнэсу ў Германіі, якая з'яўляецца прызнаным эканамічным лакаматывам еўрапейскага кантынента? Эксперт па эканоміцы ФРГ (ён жа кіраўнік прадстаўніцтва нямецкай эканомікі ў Беларусі) Уладзімір Аўгусцінскі адзначыў, што ў Германіі зараз амаль 3 700 000 прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнэсу, унёсак якіх у ВУП краіны складае звыш 50%. У іх штаце — 60% усіх працуючых у краіне. Заўважым, усе гэтыя прадпрыемствы ў пераважнай большасці з'яўляюцца членамі гандлёва-прамысловых палат, што само па сабе спрыяе развіццю бізнэсу. Для параўнання ў Беларусі, па даных 2011 года, было каля 230 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў, дзейнічала больш 90 тысяч малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Там працуюць 1,2 мільёна чалавек (ці 27% ад агульнай колькасці).

Нямецкія госці падзяліліся досведам пераходу да рынкавай эканомікі. Дэтлеф Ройтэр, кіраўнік аддзела міжнародных сувязяў і інавацыйнай гандлёва-прамысловай палаты з горада Эрфурт зямлі Цюрынгія гаворыць, што пры ГДР у іх была жорсткая планавая эканоміка. За кароткі тэрмін удалося яе грунтоўна рэфармаваць. У асноўным дзякуючы таму, што стварылі інструменты падтрымкі развіцця малога і сярэдняга бізнэсу. Працэс трансфармацыі быў складаны і часам хваравіты, але немцы ўсё ж прыстасаваліся да работы ва ўмовах рынкавай канкурэнцыі, наладзілі выпуск новых запатрабаваных вырабаў. Напрыклад, сонечных батарэй для абагрэву жылых прыватных дамоў. У Цюрынгіі важную ролю пачаў адыгрываць лагістычны складнік эканомікі.

Ёсць інтарэс

Як вынікае з сустрэчы прадстаўнікоў дзелавых колаў дзвюх краін, мы прывабныя для замежных інвестараў. «Нямецкія кампаніі зацікаўленыя актыўней працаваць з малым бізнэсам Беларусі» — гэты тэзіс належыць новаму паслу Германіі ў нашай краіне Вальфраму Маасу. На думку пасла, падтрымка эканамічных адносін Беларусі і Германіі будзе мець ключавую ролю ў яго дзейнасці ў Беларусі як дыпламата. Ён падкрэсліў вялікі патэнцыял малога і сярэдняга бізнэсу ў нашай краіне.

Кіраўнік праекта «Нямецкая эканамічная група ў Беларусі» Аляксандр Кнут выклаў свой погляд і меркаванні калег адносна сітуацыі з прадпрымальніцтвам у нашай краіне — своеасаблівы погляд збоку. У Беларусі ўнёсак дзяржаўных прадпрыемстваў у ВУП складае 75%. Як павысіць долю малога і сярэдняга бізнэсу ў ВУП? Пайсці па шляху стварэння яго новых суб'ектаў гаспадарання, як выказаўся Аляксандр Кнут, мікрапрадпрыемстваў? Але гэта будзе мець нязначны эфект, больш за тое, можа толькі абвастрыць канкурэнцыю паміж імі, у выніку чаго частка іх абанкруціцца. Стварэнне новага бізнэсу ў масавым парадку можа стаць непрадуктыўным, калі не контрпрадуктыўным, лічыць Аляксандр Кнут. Павысіць ролю прыватных прадпрыемстваў, іх унёсак у стварэнне дабаўленай вартасці дапаможа аднолькавы з дзяржаўнымі вытворцамі доступ да фінансавых і матэрыяльных рэсурсаў. Гэта, акрамя іншага, дазволіць прыватнаму бізнэсу пашырыць свой экспарт, выпускаць новую прадукцыю, засвоіць новыя віды паслуг, якіх пакуль няма на беларускім рынку.

Яшчэ эксперт звярнуў увагу на такую акалічнасць: у нашай краіне дастатковая колькасць малых і сярэдніх прадпрыемстваў: не хапае іх росту. У асноўным такія прадпрыемствы, якія ўзніклі 5-6 гадоў таму, не растуць, не набіраюць вытворчую моц, слаба павялічваюць персанал. А вельмі важна, каб яны сталелі, набіралі абароты, заваёўвалі новыя рынкі збыту. Хаця гэтаму можа, напрыклад, садзейнічаць выдатная інфраструктура, прычым яна значна лепшая чым у Расіі, Украіне, Малдове. У параўнанні з імі ў Беларусі і значна меншы ўзровень карупцыі як у эканамічнай сферы, так і ў адміністрацыйнай. «У вас шмат чаго змянілася ў лепшы бок у адносінах да малога і сярэдняга бізнэсу, але гэтую работу трэба абавязкова працягваць», — гаворыць Аляксандр Кнут.

Карысная інфармацыя з першых рук

Зразумела, нямецкіх гасцей (а паўдзельнічаць у 6-м Дні ў Беларусі прыбыла дэлегацыя дзелавых колаў зямлі Цюрынгіі ФРГ) у першую чаргу цікавілі ўмовы і перспектывы супрацоўніцтва з патэнцыяльнымі беларускімі партнёрамі. Відаць, аб гэтым дакладнай інфармацыі ў Германіі недастаткова. Таму дырэктар дэпартамента па прадпрымальніцтве Мінэканомікі Аляксандр Груздоў даволі падрабязна расказаў гасцям аб практыцы дзяржаўнай падтрымкі і мерах садзейнічання развіццю малога і сярэдняга бізнэсу. У прыватнасці, сёння рэгістрацыя новага прадпрыемства ажыццяўляецца ў дзень падачы заяўкі, а з 2011 года паступова ўкараняецца дзяржаўная электронная рэгістрацыя суб'ектаў гаспадарання. Для іх адменены 1,5 тысячы формаў першасных уліковых дакументаў, з абавязковых засталіся ўсяго 8. Істотна скарочаны спіс відаў дзелавой дзейнасці, якія абавязаны ліцэнзавацца. Таксама спрошчаны і сам парадак атрымання ліцэнзіі. Прадстаўнікі бізнэсу маюць права набываць ва ўласнасць зямельныя ўчасткі, якія раней былі прадстаўлены ў карыстанне для абслугоўвання тых збудаванняў, што знаходзяцца на ёй.

Аляксандр Груздоў адзначыў значныя перамены ў падатковай сістэме, увогуле знізіўся яе фіскальны ціск на эканоміку. Па сваёй структуры падаткі адпавядаюць стандартам эканамічна развітых краін.

Прагучала і іншая цікавая інфармацыя. З 24% да 18% зніжаны падатак на прыбытак для бізнэсу. Гэта самая нізкая стаўка ў Мытным саюзе. Сярэднестатыстычны падаткаплацельшчык плаціць усяго 5 падаткаў, і, як правіла, штоквартальна. Асаблівыя падатковыя рэжымы існуюць у свабодных эканамічных зонах і тэхналагічных парках. Значныя перавагі і льготы прадстаўлены для малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў невялікіх гарадах і пасёлках. Плануецца стварэнне антыманапольнага органа з яго прадстаўніцтвамі, якія будуць незалежнымі ад мясцовай улады ў рэгіёнах. Падрыхтаваны змяненні ў парадак дзяржаўнай падтрымкі малога і сярэдняга бізнэсу, практыкуецца ўзгадненне з бізнэс-саюзамі праектаў новых нарматыўных актаў.

Дырэктар нядаўна створанага Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі Дзмітрый Клеўжыц выклаў сваё бачанне партнёрства і супрацоўніцтва. На яго погляд, у нашай краіны ёсць прывабныя для нямецкіх інвестараў умовы ўкладваць сродкі ў эканоміку Беларусі. У прыватнасці, патэнцыял Беларуска-кітайскага індустрыяльнага тэхнапарку, які ўжо пачалі ўзводзіць на тэрыторыі Мінскай вобласці непадалёку ад Смалявічаў. Там, падкрэсліў Дзмітрый Клеўжыц, чакаюць не толькі кітайскіх інвестараў, але і інвестараў з іншых краін. Гэта будзе шматнацыянальны парк па інвестыцыйным насычэнні, дзе будуць прадстаўлены сусветна вядомыя

фірмы. Са свайго боку, агенцтва будзе клапаціцца аб тым, каб іх бізнэс развіваўся ў спрыяльных умовах. Бо прынцып агенцтва — працаваць з усімі інвестарамі, якія звяртаюцца да яго. Увогуле агенцтва пазіцыніруе сябе як надзейны партнёр у Беларусі, запэўніў Дзмітрый Клеўжыц.

«Мы развіваемся, мы расцём»

Старшыня праўлення бізнэс-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя Куняўскага Георгій Бадзей пачаў з камплімента гасцям: у саюзе вывучаюць нямецкі досвед падтрымкі прадпрымальніцтва — у прыватнасці, Цюрынгіі. Асабліва ўразіла там арганізацыя работы Зямельнага банка і сістэма падтрымкі інавацыйнага прадпрымальніцтва. «Сапраўды, гэта сістэма працуе, яна вартая пераймання і ў нас», — гаворыць Георгій Бадзей. Далей ён перайшоў да хатніх спраў. Нагадаем, што бізнэс-саюз як структура існуе больш за 20 гадоў, а яго старшыня валодае прадметам размовы.

Карціну ён намаляваў наступную. Апошнім часам у Беларусі назіраецца колькасны рост прадпрымальнікаў. Цікавая станоўчая дынаміка развіцця малога бізнэсу. Калі ў самым пачатку яго станаўлення лідарамі ў гэтай справе былі Мінск і абласныя цэнтры, то ў апошнія 5 гадоў апераджальнымі тэмпамі малы бізнэс прырастае ў рэгіёнах, невялікіх гарадах і пасёлках. Гэта станоўчы факт і абнадзейвае. Тут немалая заслуга ўрада краіны, які мэтанакіравана паляпшае ўмовы існавання прадпрымальнікаў, садзейнічае развіццю іх дзелавой актыўнасці. Таксама сваю ролю адыграла станаўленне на месцах структур па падтрымцы дзелавых і энергічных людзей. Напрыклад, летась у кожным раёне Мінскай вобласці з'явіліся такія структуры.

— Мы развіваемся, мы расцём, — сцвярджае старшыня бізнэс-саюза. Сваю думку ён падмацаваў такой лічбай: летась доля малога і сярэдняга бізнэсу ў экспарце краіны склала 46,1%. Гэта гаворыць аб павышэнні значнасці прыватных прадпрыемстваў. Але, з іншага боку, ёсць яшчэ шмат праблемных пытанняў. Бадай, самае злабадзённае з іх — адсутнічае магчымасць гаспадарыць на роўных умовах з дзяржаўнымі прадпрыемствамі. Ім, у першую чаргу гігантам індустрыі, галіновымі міністэрствамі надаецца ўвага. А малы бізнэс «развіваецца як хоча».

Прэзідэнцкая Дырэктыва №4, па словах Георгія Бадзея, дастаткова комплексны і праграмны дакумент, рэалізацыя якога ў поўным аб'ёме дазваляе сфарміраваць канкурэнтнае асяроддзе, развіваць прыватную ўласнасць, ліквідаваць на гэтым шляху перашкоды і бар'еры, знізіць падатковую нагрузку. Увогуле надышоў час успрымаць малы і сярэдні бізнэс як важны інструмент структурнай перабудовы эканомікі, давесці да канца пяцігодкі яго долю ў ВУП да 30%. Сярод праблемных момантаў развіцця прадпрымальніцтва Георгій Бадзей адзначыў і той факт, што значная частка прадпрымальнікаў засяроджана ў гандлі і грамадскім харчаванні. У іншых сферах бізнэс прадстаўлены куды менш (скажам, у той жа апрацоўваючай прамысловасці, інфраструктуры), аказанне вытворчых паслуг толькі пачынаецца засвойваць. Але гэта ён патлумачыў асаблівасцямі першаснага назапашвання капіталу.

Правільны партнёр — паспяховы бізнэс

Хаця падчас дыскусіі і адзначалася, што ў Беларусі марудна растуць прыватныя кампаніі, тым не менш на сустрэчы прагучаў аповед з вуснаў Ханса-Юргена Зора, дырэктара фірмы «Алкопак Гмбх» аб тым, як яго прадпрыемства за адносна нядоўгі перыяд выйшла на салідны ўзровень. Аднойчы да Ханса-Юргена Зора паступіла прапанова ад, як ён сказаў, аднаго беларускага грамадзяніна. Яны сустрэліся. Патэнцыйны партнёр зрабіў добрае ўражанне на немца, ён тады ўпершыню ўсур'ёз задумаўся аб бізнэсе ў нашай краіне. Беларусь для яго была ў многім невядомая тэрыторыя. Тым не менш прыняў прапанову «беларускага грамадзяніна». Так у Гомелі ўзнікла кампанія «Алкопак Гмбх». Яе спецыялізацыя — упакоўка для харчовай прамысловасці (напрыклад, для вытворчасці напояў). З часам прадпрыемства ператварылася ў вядомага вытворцу, сёння ён стварыў ужо даччынае прадпрыемства. У вытворчасць новых відаў прадукцыі ўкладваюцца значныя інвестыцыі — мільёны еўра. Па словах Ханса-Юргена Зора, ёсць намер расці далей, развівацца, выпускаць прадукцыю, якая будзе ісці на экспарт.

Хацелася, каб такіх прыкладаў удалага інвесціравання ў нашу эканоміку было больш.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

■ Перашкоды на маршрутах

ДЗЕ ГУБЛЯЮЦЦА ГРОШЫ?

Шляхі развіцця турызму абмеркавалі на калегіі дзяржкантролю ў Брэсце

«Многія прыезджыя людзі адзначаюць чысціню нашых гарадоў, дагледжанасць дарог, прыдарожных палос, агульную прывабнасць. Такія чысціня і парадак абыходзяцца дзяржаве нятанна. І добра было б, каб хоць частку ўказаных сродкаў зарабляла турыстычная галіна краіны» — гэту вытрымку з даклада першага намесніка старшыні Камітэта дзяржкантролю Брэсцкай вобласці Міхаіла Сяркова, відаць, можна было б паставіць эпіграфам да пленарнага пасяджэння калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю Брэсцкай вобласці, прысвечанай пытанням развіцця турызму. Удзельнікі сходу абмеркавалі стан турыстычнай галіны рэгіёна з выхадам на агульныя праблемы краіны, а таксама эфектыўнасць выкарыстання сродкаў, выдзеленых на Дзяржаўную праграму развіцця турызму ў краіне.

Тое, што праблема, вынесеная на парадак дня, надзвычай актуальная, сведчыла прадстаўніцтва ўдзельнікаў: члены калегіі і прадстаўнікі Камітэта Дзяржкантролю РБ, кіраўнікі абласных камітэтаў КДК, міністэрстваў і ведамстваў краіны, шэраг зацікаўленых службовых асоб рэгіёна. Літаральна ўсе выступоўцы свае даклады і паведамленні пачыналі з таго, што на шляху развіцця турызму зроблена многа. А хто б спрачаўся? Але ж лагічным выглядае і тое, што ўдзельнікі пасяджэння засяродзіліся на недахопах і праблемах. Прагучала красамоўная статыстыка. У некаторых еўрапейскіх краінах турыстычная галіна прыносіць у агульную скарбонку краіны да 9 працэнтаў сродкаў. У нас гэтая лічба складае да крыўднага мала — 0,1-0,2 працэнта. Нам бы давесці яе хоць бы да 0,9, і тое было б амаль што прарывам. Гэты прарыў як быццам бы заклікана ажыццявіць Дзяржаўная праграма развіцця турызму ў краіне на 2011—2015 гады. Але не ўсё так проста, пераканаліся ўдзельнікі дыскусіі на лічбах, фактах, прыкладах.

Варта адзначыць, што іх, удзельнікаў, было нашмат больш, чым сядзела ў зале. Меркаванні многіх кампетэнтных асоб былі запісаны на відэа, якое транслявалася з экрана. Адзін з кіраўнікоў вядомай брэсцкай турфірмы расказваў, як па запрашэнні нашага боку ў вобласці гасцявалі дырэктары польскіх турыстычных прадпрыемстваў. Яны былі ў захапленні ад праграмы, ад аб'ектаў, якія ім паказалі. А вось у адрас гасцініц, ды наконт узроўню сэрвісу ў іх (і ў іншых аб'ектах) выказалі сур'ёзныя нараканні. Што ёсць, тое ёсць. Таму чакаць, што названыя кіраўнікі актыўна павязуць туды групы сваіх суайчыннікаў альбо заходніх турыстаў, было б вялікім аптымізмам. Тэма суседняй Польшчы нярэдка ўзнікала падчас дыскусіі, бо Брэст — вялікі транзітны пункт на шляху турыстаў з усходу на захад і наадварот. Фактычна штодзень маскоўскія цягнікі прывозяць арганізаваныя групы турыстаў, якія на нашым вакзале сустракаюць польскія аўтобусы і вязуць далей цераз мяжу. Цягнікі прыбываюць раніцай. А снедаюць турысты ўжо на польскай тэрыторыі. І як запэўнілі нашы чыноўнікі ад гандлю і грамадскага харчавання, арганізаваць сняданкі для прыезджых у Брэсце магчыма. Але ніхто не будзе марнаваць час на гэта, бо кіраўнікі тургруп спяшаюцца заняць чаргу на мяжы: пераход можа заняць пяць-сем гадзін, таму ўжо не да сняданкаў на вакзале. Вось калі б на мяжы можна было арганізаваць працэс больш хутка і дакладна (і такія прапановы прагучалі), тады паявіўся б сэнс згадваць аб выручцы, якую мы фактычна аддаём суседзям.

Шмат прыкладаў таго, дзе губляюцца рэальныя грошы ад няспрытнасці, няўмення ці нежадання зарабіць, прыводзілася на пасяджэнні. Узяць хоць бы гандаль сувенірамі. Усе, хто бывае за межамі сваёй краіны, стараюцца прывезці нейкую мілую драбязу на памяць. Нашы госці таксама, відавочна, не супраць набыць сувенір з Беларусі. А што яны вязуць з сабой? Такім пытаннем задаліся спецыялісты дзяржкантролю Брэсцкай вобласці пры падрыхтоўцы калегіі. Высветлілася, што напрыклад, пасля наведвання Белавежскай пушчы турыст пакідае на сувеніры ў сярэднім 20 цэнтаў. І ўсё таму, што цікавую аўтэнтычную рэч у бойкіх месцах не надта і купіш. Брэсцкая фабрыка сувеніраў «Славянка» мае нядрэнны асартымент прадукцыі. Ды толькі рэдкі турыст паедзе ў фірменную краму фабрыкі, якая знаходзіцца ў Заводскім раёне, далёка ад цэнтра. У гасцініцы «Інтурыст» сувеніраў наогул не прадаюць. Не купіш іх і ў іншых прадпрыемствах туріндустрыі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Губляем і на вялікім, і на дробязях, якія таксама ў суме выліваюцца ў прыстойныя лічбы. Хто быў у краінах Еўрасаюза, ведае, як там абаронены інтарэсы вытворцаў сваіх паслуг: наш гід ні ў якім разе не стане праводзіць экскурсію па Парыжы альбо Берліне, бо за такія дзеянні можна заплаціць штраф у тысячы еўра. У нас жа свае экскурсаводы працуюць толькі ў пушчы і Брэсцкай крэпасці. Ахапіць паслугамі «свайго гіда» іншыя аб'екты вобласці проста немагчыма. Ды і структуры такой няма, якая аштрафавала б замежнага экскурсавода за работу без ліцэнзіі. Відавочна, спачатку трэба стварыць сістэму, а потым рэгуляваць рынак паслуг.

Не бліскуча выглядае сітуацыя з рэкламай турыстычных паслуг. Амаль кур'ёзны выпадак адбыўся з рэкламным шчытом, які так і не з'явіўся ўздоўж трасы М1 каля пункта дарожных збораў Федзькавічы Жабінкаўскага раёна. Праз названы пункт штодня праходзіць мноства велікагрузных аўтамабіляў. Гэта першы прыпынак, які робяць вадзіцелі на шляху з Еўропы пасля пераходу мяжы. Тут і аўтастаянка пакідае жадаць лепшага (ва ўсялякім выпадку, яе інфраструктура), і ніякага аб'екта грамадскага харчавання да нядаўняга часу не было. У 2010 годзе ў краме вёскі Федзькавічы Жабінкаўскі райспажыўсаюз адкрыў невялікі кафетэрый. З той пары названая арганізацыя вядзе перапіску з дарожнымі ведамствамі, каб атрымаць дазвол на ўстаноўку свайго рэкламнага шчыта. Такога дазволу ім не даюць, спасылаючыся на правілы бяспекі руху. У дарожнага ведамства найгалоўнейшы прынцып: «Нічога не павінна адцягваць увагу вадзіцеля ад дарогі». І кааператары супакоіліся: не даюць дык не даюць...

Узровень прыдарожнага сэрвісу не маглі абысці ўвагай удзельнікі пасяджэння. Начальнік упраўлення гандлю і паслуг Брэсцкага аблвыканкама Валянціна Хандошка паведаміла, што адлеглась паміж прыпынкамі, дзе можна падарожнаму чалавеку адпачыць і перакусіць, складае 36 кіламетраў на трасе Брэст — Масква, галоўнай магістралі краіны. Мабыць, гэтага дастаткова. Але на трасе Кобрын — Гомель такія прыдарожныя аб'екты па пальцах пералічыш. У гэтым, напрыклад, давялося пераканацца гэтым летам па дарозе на фестываль «Мотальскія прысмакі».

Дарэчы, сам фестываль згадваўся падчас абмеркавання як удалы турыстычны брэнд Іванаўскага раёна. Справядліва згадваўся. Толькі, на маю думку, і гэты цікавы, унікальны ў сваім родзе фестываль мае патрэбу ў развіцці. Колькі гадоў ён праходзіць па практычна адной і той жа падобнай праграме! Захоўваць традыцыі таксама важна... Але... штогод сельсаветы прывозяць узоры прысмакаў са сваіх вёсак, якія рыхтуюць супрацоўнікі мясцовага органа ўлады ды работнікі культуры — зноў жа, не без указанняў «зверху». А можа, варта правесці які-небудзь кірмаш каўбас розных вытворцаў, і не толькі мотальскіх. І прадаваць іх са зніжкамі, і не паскупіцца на папярэднюю рэкламу. І тады колькасць турыстаў у Моталі павялічыцца, неабавязкова прыезджых, сваіх таксама. Магчыма, больш трэба прыцягваць да ўдзелу ў названым фэсце аграсядзібы. Многія з іх маюць арыгінальную кухню.

Агратурызм, паводле меркавання ўдзельнікаў калегіі, тая турыстычная галіна, якая найбольш паспяхова развіваецца апошнім часам. 178 аб'ектаў агратурызму вобласці прынялі ў 2011 годзе 15167 турыстаў, што на 15% больш, чым у годзе папярэднім. Адзначалася, што для далейшага развіцця галіны трэба ўдасканаліць заканадаўства, якое рэгламентуе гэтую сферу.

Шмат іншых рэзерваў развіцця турызму было названа на пасяджэнні. На жаль, не пахвалішся развіццём воднага турызму ў рэгіёне. Зусім мала гасцініц, якія адпавядаюць міжнародным стандартам. Так, з 65 атэляў Брэстчыны ўсяго 7 сертыфікавана на катэгорыю. 2 «зоркі» атрымалі дзве з іх, 3 «зоркі» — чатыры гасцініцы і 4 «зоркі» — адна.

Па выніках калегіі сфармуляваны прапановы, накіраваныя на ўдасканаленне заканадаўства ў сферы аграэкатурызму, зніжэнне кошту і спрашчэнне парадку выдачы віз замежным турыстам, абнаўленне воднага транспарту, аднаўленне судабудаўнічай індустрыі.

Зацікаўленым ведамствам прапанавана правесці інвентарызацыю стану аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны і прыняць меры па іх захаванні (аб праблемах у гэтай галіне «Звязда» пісала 25 верасня). Прапанавана таксама перагледзець Генеральную схему развіцця прыдарожнага сэрвісу да 2015 года на рэспубліканскіх дарогах, вывучыць магчымасць разліку замежнымі грамадзянамі ў валюце на ўсіх аб'ектах прыдарожнага сэрвісу, пашырыць асартымент і палепшыць якасць грамадскага харчавання, стварыць сістэму па рэалізацыі айчыннай сувенірнай прадукцыі, заняцца развіццём інфраструктуры паляўнічых гаспадарак.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ

Наименование предмета аукциона	Капитальное строение (здание гаража)	Капитальное строение	Здание хлебопекарни и артскважина
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская область, Пружанский район, г.п. Рукжаны, ул. Урбановича, д. 3	Брестская область, Ивановский район, Горбахский с/с, д. Овзичи, ул. Центральная, д. 38	Брестская область, Барановичский район, Молчадский с/с, д. Молчадь, ул. Слонимская, 22 и 1,2 км южнее д.Молчадь, артскважина
Продавец недвижимого имущества	Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, тел. (017) 228 13 62, (01632) 9 14 97	Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», тел.(0162) 20 57 21	Республиканское унитарное производственное предприятие хлебопекарной промышленности «Брестхлебпром» филиал Барановичский хлебозавод, тел.(0163) 47 07 49, 47 18 89, 47 05 33
Сведения о предмете аукциона	Капитальное строение (здание гаража), одноэтажное, кирпичное, 1997 г.п, общая площадь 71,1 кв.м, с кирпичной пристройкой. Земельный участок площадью 0,0093 га, использовать для размещения объектов промышленного производства, торговли, услуг; срок аренды – 50 лет.	Капитальное строение (здание почты) 1985 г.п., 1 эт., пеноблочное обложенное кирпичом, общая площадь 53,4 кв.м, пристройка. Земельный участок площадью 0,0355 га; срок аренды – 30 лет; направления возможного использования, – размещение объектов культурно-просветительного и зрелищного, административного назначения, образования и воспитания, розничной и оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции, промышленных объектов (с учетом комплексного развития территории по согласованию с отделом архитектуры и строительства Ивановского райисполкома).	Здание хлебопекарни, одноэтажное, кирпичное, 1968 г.п., общая площадь – 631,5 кв.м, с одной кирпичной, одной блочной пристройкой, тамбуром, двумя блочными складами, навесом, водопроводной сетью, протяженностью 664,5 м, электрическим кабелем, протяженностью 55,2 м, дорожками площадью 1104 кв.м, забором, воротам; сооружение артскважины состоит из водозабора подземных вод (А) глубиной 59 м. Земельный участок площадью 0,4720 га и 0,3295 га; установлены ограничения в использовании на площади 0,0254 га в связи с расположением его в охранных зонах линий электропередачи 10кВ; срок аренды – 50 лет.
— Кожны банк самастойна распрацоўвае пералік прыкмет плацежнасці іншаземных грашовых знакаў. Пры гэтым улічваюцца патрабаванні цэнтральных замежных банкаў, якія выпускаюць банкноты ў абарачэнне, і іншаземных банкаў-пасярэднікаў, з якімі заключаны адпаведныя дамовы. Пералік прыкмет плацежнасці валюты змяшчаецца прыблізна каля абменных кас. Звычайна «ніжнюю планку» гэтага пераліку складаюць патрабаванні цэнтральнага замежнага банка, які выпускае валюту ў абарачэнне і, адпаведна, вызначае прыкметы яе плацежаздольнасці. Аднак гэта зусім не азначае, што беларускія банкі, у сваю чаргу, абавязаны прытрымлівацца выключна гэтых правіл, — сцвярджае Віктар Сасноўскі. На практыцы беларускія банкі вывозяць набытую валюту ў замежны банк-карэспандэнт. І таму яны распрацоўваюць пералік, улічваючы яшчэ і яго патрабаванні! Але не ўсе беларускія банкі займаюцца вывазам валюты за мяжу. У такім выпадку распрацоўваецца ўласны спіс прыкмет плацежаздольнасці замежных купюр. Аднак пры гэтым ужо «пальма першынства» належыць беларускім інкасіруючым банкам, з якімі ўстаноўлены адпаведныя карэспандэнцкія адносіны. Але пры абмене папсаванай валюты банк можа пайсці і насустрач кліенту. Напрыклад, узяць той жа долар ці еўра на інкаса, пасля чаго яго праверацъ на плацежаздольнасць. Трэба мець на ўвазе, што гэтая паслуга можа быць і платнай. Зноў жа, усё залежыць ад канкрэтнага банка і ад яго тарыфнай палітыкі.

— А ці займаецца абменам валюты Нацыянальны банк?

— Не. Згодна з Банкаўскім кодэксам, галоўная фінансавая ўстанова краіны мяняе выключна беларускія рублі. Нацбанк таксама не можа патрабаваць ад усіх банкаў выканання адзінага стандарту знешняга выгляду замежнай валюты, калі з ёй адбываюцца якіясьці фінансавыя аперацыі. Таму пры набыцці валюты трэба ўважліва глядзець, што ж вам прадаюць. І, зразумела, вельмі беражліва ставіцца да купюр, каб іх пасля без праблем прынялі.

А беларускія рублі памяняць прасцей

Але большасць людзей куды часцей трымае ў руках беларускія рублі. І таму рызыка атрымаць пабітую жыццём купюру ўзрастае. Зрэшты, і пазбавіцца ад яе значна лягчэй, бо дзейнае заканадаўства гэтаму спрыяе.

— Працягласць «жыцця» беларускіх грошай залежыць ад іх наміналіта і тых умоў, у якіх яны захоўваюцца. Чым драбнейшая купюра, тым больш разоў яна будзе пераходзіць з рук у рукі і тым хутчэй зношваца, — працягвае Віктар Сасноўскі. — Менш за ўсіх «жывуць» купюры наміналамі да пяцісот рублёў — прыкладна каля года. Банкноты вартасцю ад адной да дзесяці тысяч служаць да трох гадоў. Купюра з буйным наміналамі (ад 20 тысяч рублёў і вышэй) можа знаходзіцца ў абарачэнні да пяці гадоў.

Банкнота можа падлягаць абмену ў двух выпадках. Па-першае, калі яна фізічна вельмі зношана. У асаблівасці гэта датычыцца дробных купюр, намінал якіх меншы за тысячу рублёў. Але гэты працэс натуральны, і з ім нічога зрабіць нельга. Кожная рэч старэе, і грошы — не выключэнне. Другі ж крытэрый — калі да купюры выпадкова «прыклалі руку». Да такіх пашкоджанняў адносяцца надрывы, у тым ліку склееныя празрыстым скотчам, нязначныя адтуліны, праколы, адсутнасць ражкоў. Акрамя таго, у гэтую катэгорыю трапляюць і нязначныя забруджванні грашовых знакаў, з якімі сутыкаўся кожны: невялікія плямы, пабочныя надпісы, адбіткі пячатак. Калі такія купюры трапляюць у структурныя падраздзяленні Нацыянальнага банка альбо ў камерцыйны банк, то касавыя работнікі іх адсартоўваюць. І сапсаваныя грошы будуць знішчаны.

Старымі плацежаздольнымі беларускімі банкнотамі можна смела разлічвацца пры любых пакупках.

Трэба зазначыць, што кожны банк, які вядзе сваю дзейнасць у Беларусі, павінен прымаць такія айчынныя рублі для абмену і выканання банкаўскіх аперацый. Акрамя таго, у разліку такімі грашовымі знакамі не могуць адмовіць работнікі юрыдычных асоб і індывідуальныя прадпрымальнікі ўсіх формаў уласнасці. Таму, напрыклад, можна смела заплаціць такімі грашыма на кірмашы.

— Але ж сустракаюцца і такія банкноты, якім вельмі моцна «дасталася» ад жыцця...

— На жаль, у абарачэнні знаходзяцца і моцна пашкоджаныя купюры. Іх плацежаздольнасць можа вызначыць толькі спецыяліст, які валодае адмысловымі ведамі і праводзіць дадатковае даследаванне, — гаворыць Алена Гутоўская.

Абмяняць такую банкноту можна, калі ад яе засталося мінімум 55 працэнтаў першапачатковай плошчы. Прыдатная гэта лічба і тады, калі купюру склеілі з кавалкаў, якія, безумоўна, належаць аднаму і таму ж грашоваму знаку. Каб вызначыць, колькі ж плошчы згубіла банкнота, касір выкарыстоўвае спецыяльную сетку. Яе памеры адпавядаюць памерам цэлай купюры неабходнага наміналу. Складаецца ж яна з 200 клетак — 20 па даўжыні і 10 па шырыні.

Бывае і так, што купюра прайшла ў літаральным сэнсе праз агонь і ваду. Альбо на яе вылілі актыўнае рэчыва. Ці яна пасля кантакту з якімсьці хімікатам змянілася ў памерах. Пры такім раскладзе пашкоджанні не павінны замінаць вызначэнню сапраўднасці грошай. У рэшце рэшт, калі заключэнне выносіцца на карысць кліента, то на банкноце ставіцца штамп «Абменена», назва банка, яго ідэнтыфікацыйны код, дата, імянны штамп і подпіс асобы, якая абмяняла купюру. Не існуе абмежаванняў па колькасці і агульным намінале пры абмене такіх грошай. Камісійная плата пры гэтым не ўзымаецца.

Але моцна пашкоджаную сапраўдную купюру могуць і не абмяняць. Напрыклад, страты яе плошчы большыя за 45 працэнтаў. Ці з дзвюх розных банкнот «скляпалі» адну. Гэта відаць хаця б па розных серыйных нумарах. Такі грашовы знак прызнаецца неплацежным, ён не абменьваецца і не вяртаецца кліенту. На ім ставіцца штамп «У абмене адмоўлена», назва банка, яго ідэнтыфікацыйны код, дата, імянны штамп і подпіс асобы, якая адмовіла ў абмене купюры. Банкноты з прастаўленымі штампамі «У абмене адмоўлена» і «Абменена» падлягаюць знішчэнню.

Старыя і сапсаваныя папяровыя грашовыя знакі існуюць ужо амаль тры с паловай стагоддзі. Бо першыя купюры былі масава выпушчаны ў Стакгольме ў далёкім 1661 годзе. І «пацярпелыя» ад жыцця купюры будуць з'яўляцца да таго часу, пакуль чалавецтва цалкам не пяройдзе на безнаяўны разлік. Але нават па самых аптымістычных прагнозах, гэты працэс расцягнецца як мінімум на паўстагоддзя.

ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

У кастрычніку 2005 года на Кіпры вырашылі змагацца з «мастакамі» на мясцовых фунтах. Цэнтральны банк астраўной дзяржавы апублікаваў спецыяльную інструкцыю. Згодна з ёй, размалёўка нацыянальных грашовых банкнот стала расцэньвацца як парушэнне закона. І за гэта накладаўся штраф у памеры да тысячы кіпрскіх фунтаў. Але ў 2008 годзе Кіпр перайшоў на еўра. І калі пералічыць тысячу фунтаў па абменным курсе, то граничная сума штрафу для непрызнанага «мастака» складае 1708 еўра. Таму пільнасць пры наяўным разліку яшчэ ніхто не адмяняў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК

■ Палессе і ўвесь свет

ФІЛАСОФІЯ СЯКЕРЫ І МАСТАКА ПА ДРЭВЕ

Іван Супрунчык, разьбяр па дрэве са Століншчыны, — добра вядомы ў Беларусі чалавек, майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Работы таленавітага народнага мастака захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, музеі старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі, Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі, Столінскім раённым краязнаўчым музеі, Мотальскім музеі народнай творчасці, музеі-сядзібе «Пружанскі палацык», музеі народнага мастацтва Мар'яна Пакропкі ў Атрэмбусах (паблізу Варшавы, у Польшчы). А яшчэ ж — музей у родных Цераблічах, на Століншчыне. Яго яшчэ называюць Цэнтрам драўлянай скульптуры. Немалога пераліку запатрабуюць і згадкі пра ўдзел Івана Піліпавіча ў выстаўках і пленэрах, пра ўзнагароды, якімі адзначаны майстар-інсітнік.



Відаць, яшчэ адной узнагародай для палешука стала і выданне альбома «Палескія былі ў творах Івана Супрунчыка» (Мінск, «Літаратура і Мастацтва», 2012 год). Фундатары праекта — Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Столінскі раённы выканаўчы камітэт. Звычайна на вокладках такіх мастацкіх выданняў не пазначаюць аўтарства. І шкада. Напрыклад, здымаючы з паліцы сваёй хатняй бібліятэкі маскоўскі, 1989 года, альбом «Заір Ісаакавіч Азгур», я ведаю, што яго зрабіў, прыдумаў мастацтвазнаўца Барыс Крэпак. А альбом «Анатоль Мікалаевіч Тычына. Мой Мінск», выдадзены ў 2008 годзе «Белпрынтам», укладзены, выпісаны ці не кожным пяшчотным слоўцам Людмілай Налівайка. А іх імёны — толькі ў выхадных звестках, усё ж не на вокладцы. Вось і альбом «Палескія былі...» і напісаны, і прыдуманы Вольгай Аляксандраўнай Лабачэўскай. Яшчэ некалькі гадоў таму яна (таксама з выдавецтвам «Літаратура і Мастацтва») дала жыццё першаму ў гісторыі айчыннага мастацтвазнаўства асобнаму альбому пра інсітнага, прымітыўнага майстра — «Сялянская энцыклапедыя ў творах Мікалая Тарасюка». Здавалася б, пракладзена новая дарога... Ды толькі больш падобных прац не з'явілася. Ажно да выдання кнігі-альбома пра Івана Супрунчыка.

Несумненна, у Вольгі Аляксандраўны былі памочнікі. Найперш — фотамастак Георгій Ліхтаровіч. Углядаючыся ў зробленыя ім фатаграфічныя выявы работ разьбяра з вёскі Цераблічы, усведамляеш: здымкі твораў мастацтва патрабуюць асабліва чулага зроку. Кіраўнік праекта — Алена Дубойская. Рэцэнзент альбома — доктар мастацтвазнаўства, прафесар Рыгор Фёдаравіч Шаура. Асобна хацелася б назваць Ларысу Быцко. У выхадных звестках яна сціпла пазначана як укладальнік даведачных тэкстаў. А між тым начальнік аддзела традыцыйнай культуры Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра з поўным правам можа лічыцца першым памочнікам аўтараў тэксту, здымкаў, выдаўцоў у ажыццяўленні задумы. Рыхтаваць альбом падобнага кшталту, арганізоўваць збор фактаграфічнага і ілюстрацыйнага матэрыялу — справа заўсёды надзвычай складаная. На шчасце, у Вольгі Лабачэўскай у гэтым плане ёсць памочнікі, шчырыя паплечнікі.

І ўсё ж альбом пра майстра-інсітніка, унікальнага палескага разьбяра — сага, праспяваная Івану Супрунчыку таленавітым мастацтвазнаўцам Вольга Лабачэўскай. Асабіста для мяне яе нарыс творчасці, яе прачулае, напоўненае болем ад захопленасці характвром работ разьбяра эсэ падаецца выключна лірычным спевам пра высокае мастацтва.

Раздзелам «У глыбінцы Палесся» і пачынаецца альбом. «Вёску Цераблічы ведаюць у Беларусі і свеце, — піша Вольга Лабачэўская. — Там жыве, там і стварае свае ўнікальныя творы Іван Піліпавіч Супрунчык. Славуты народны майстар, разьбяр па дрэве, мастак. Шмат разоў дэманстраваў ён сваё майстэрства на разнастайных выстаўках, конкурсах, фестывалях, святах. Неаднойчы і я назірала, як, не зважаючы на шумны святочны натоўп навокал і гледачоў, Іван Супрунчык высякае з дрэва скульптуру. Звычайная сялянская сякера ў яго руках здольная на незвычайныя, непаўторныя выявы. Некалькі ашчадных, дакладных зарубак — і дрэва ажывае ў творах, позірках, усмешках і постацях яго драўляных персанажаў. Калі ў цудзе вяртання спілаванаму дрэву жыцця разам з мастаком прымае ўдзел і глядач — гэта заўсёды дакрананне да сакральнай таямніцы творчасці.

Іван Супрунчык — мастак з народа і сапраўдны народны мастак. Журналісты напісалі пра яго безліч артыкулаў. Рэжысёры здымалі кінафільмы. Яго ўклад у беларускую культуру адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва. Іван Супрунчык меў нагоду ўручыць асабіста Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку свой падарунак — драўляныя скульптуркі. Тым, хто наведвае Супрунчыка ў Цераблічах, ён абавязкова паказвае падарунак, які атрымаў ад Прэзідэнта, — набор адмысловых сякер...».

Палескаму разьбяру пашчасціла: ён здолеў арыгінальна, па-свойму, выявіць у абраным матэрыяле свае мастакоўскія ўражанні ад сударкранання сучаснага жыцця з вечнасцю. Пашчасціла і на тое, што талент яго прызнаны, што веданне па талент прыносіць асалоду многім людзям. Яшчэ і тым, хто пагартае старонкі альбома «Палескія былі ў творах Івана Супрунчыка».

Сцяпан МІРШЧЫНА

Супраць насілля — паслы прыгажосці

Конкурс прыгажосці «Місіс Еўропа — 2012» пройдзе ў Мінску. З 19 па 26 лістапада ў сталіцы Беларусі збяруцца ўдзельніцы прыблізна з пятнаццаці краін Еўропы, каб паказаць сябе, абмеркаваць праблемы сучаснасці і пазмагацца за карону коштам амаль у тры тысячы еўра. Пра сам конкурс і пра тое, як ён пройдзе, расказала на прэс-канферэнцыі ўдзельніца «Місіс Сусвет — 2012» Наталля Трафімава.

Пасля конкурсу ў Растове-на-Доне сёлета Наталля стала пераможцай у намінацыі «Сяброўства», і выступіла ініцыятарам правядзення «Місіс Еўропа — 2012» у нашай краіне. Адрозненне гэтага конкурсу ад іншых такога кшталту ў тым, што канкурсанткі павінны быць замужам, мець дзяцей. Удзельніцам, як правіла, ад 20 да 45 гадоў. Тут прыгажосць не з'яўляецца ключавой. Бо конкурс мае агульную ідэю: прадухіленне і ліквідацыя гвалту супраць жанчын і дзяцей. Канкурсанткі дзеляцца вопытам сваіх краін і распавядаюць пра свой уласны ўклад у гэта. Да прыкладу, 2009 год быў прысвечаны тэматыцы гвалту ў сям'і, а ў 2010—2011 гг. закранаў тэмы гвалту і сэксуальнага рабства.

Вышэйзгаданы конкурс — гэта сацыяльна-культурны праект добрай волі, дзе абмяркоўваюць праблемы, якія хвалююць людзей у іншых краінах свету, і нагадваюць, што для іх вырашэння неабходна аб'яднацца. Кожнай удзельніцы патрэбна будзе выступіць на форуме, дзе абмяркуюць перспектывы развіцця дабрачынных фондаў і іх ролю ў прадухіленні і ліквідацыі гвалту супраць жанчын і дзяцей.

— Ужо на працягу дзесяці гадоў удзельніц адбірае міжнароднае журы. Дзесяць жанчын з кожнай краіны-ўдзельніцы дасылалі нам свае рэзюмэ, а мы абіралі адну, — расказала Наталля Трафімава. — Чакаецца, што будзе 15 ці 17 канкурсантак. Беларусь на конкурсе прадставіць Васіліса Рымжа.

Галоўны прыз — карона з каштоўных камянёў, якая вырабляецца штогод для кожнай прыгажуні. Але акрамя матэрыяльнай узнагароды, пераможцы будуць мець і пэўныя абавязацельствы: патрэбна арганізоўваць і праводзіць дабрачынныя мерапрыемствы і конкурсы, арыентаваныя на такія праекты.

Імёны вядучых конкурсу і спецыяльных гасцей трымаюцца ў сакрэце, але вядома, што рэпартажныя сюжэты і справаздачы з кожнага конкурснага дня можна будзе знайсці ў інтэрнэце.

Беларусь лічыцца геаграфічным цэнтрам Еўропы, таму арганізатары спадзяюцца, што гэты конкурс будзе добрай нагодай для прыцягнення новых інвестыцый у краіну. І калі свет і не выратуе прыгажосць, дык важныя пытанні вырашыць з яе дапамогай будзе магчымасць.

Алена ДРАПКО.

■ Рэверс з сецівa «Звязды»

НАДБАЎКА ПАВІННА БЫЦЬ СТЫМУЛАМ

Новы парадак атэстацыі педагогаў стаў у кастрычніку тэмай нумар адзін для беларускіх настаўнікаў. Сваім меркаваннем па гэтым пытанні, а таксама па перспектывах увядзення падушавога механізму фінансавання ўстаноў адукацыі падзяліліся з чытачамі «Звязды» міністр адукацыі Сяргей Маскевіч («Настаўнік — прафесія ад Бога», нумар за 6 кастрычніка), старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр Бойка («Кваліфікацыйная катэгорыя — не проста частка іміджу педагога», нумар за 6 кастрычніка), а таксама намеснік старшыні галіновага прафсаюза Раман Дапіра («Педагогаў адправяць на пераэкзаменоўку», нумар за 27 кастрычніка). А што думаюць наконт прапанаваных Міністэрствам адукацыі навацый самі педагогі? Друкуем некаторыя водгукі з нашага сайта www.zviazda.by.

@

Марына, настаўнік:

...Калі надбаўка за высокія паказчыкі не кампенсуе маральныя і матэрыяльныя выдаткі, то ў педагога знікае жаданне дадаткова нагружаць сябе алімпіядамі або навукова-даследчай работай. Надбаўка часта пераўтвараецца ў дадатковыя выплаты для пэўнай часткі педагагічнага калектыву. Хацелася б, каб яна стымулявала і падштурхоўвала настаўніка працаваць творча і выконваць свае абавязкі на самым высокім прафесійным узроўні. Частка маіх калег згодная з тым, што трэба ўстанавіць крытэрыі з указаннем працэнта даплаты за пэўныя дасягненні ў рабоце настаўнікаў. Напрыклад, выплачваць дзве базавыя велічыні за перамогу вучня ў раённай прадметнай алімпіядзе, паколькі настаўніку трэба працаваць з такім вучнем у напружаным рэжыме ўвесь навучальны год. Часта выплаты такога характару моцна адрозніваюцца ў розных школах, а ў некаторых школах іх увогуле няма.

@

Святлана:

Незразумела, чаму мы збіраемся наступаць на тыя ж граблі, на якія да нас ужо наступілі расіяне. Падушавая сістэма фінансавання ўстаноў адукацыі — самыя сапраўдныя граблі. Няўжо якасць адукацыі можа залежыць ад падушавой сістэмы фінансавання? У класе можа быць і 15, і 20, і 25 вучняў. Але ж забеспячэнне вучэбнага працэсу патрабуе вялікіх грошай, прычым незалежна ад колькасці дзяцей у класе. Якасць адукацыі — зусім не арыфметычная праблема. І залежнасць усіх, хто забяспечвае вучэбны працэс, ад колькасці вучняў у класе — матэматычная ўтопія (гэта, да слова, меркаванне расійскіх калег). Хто ж будзе спрачацца з тым, што ўзровень заробкаў педагогаў павінен адпавядаць значнасці той работы, якую яны робяць для падрастаючага пакалення, да і ўвогуле для ўсяго грамадства? Але толькі наўрад ці прафесійнае майстэрства настаўніка будзе залежаць ад узроўню яго заробку... Калі педагог — Настаўнік ад Бога — гэта адно. Такія педагогі і сёння, як правіла, не халтураць, калі, вядома, яшчэ не пайшлі са школы. А калі да дзяцей прыходзіць проста чалавек з дыпломам педагагічнай ВНУ, то такіх і сапраўды трэба мятлой гнаць са школы. А яшчэ лепш — туды не дапускаць. Ідэя з інтэрнатурай для выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў — вельмі слушная. Цікава, а як бы мог выглядаць экзамен па допуску да прафесіі?

@

Дасведчаны:

Дзіўна: калі пра настаўнікаў разважае міністр адукацыі, усё так прыгожа атрымліваецца. А ў школах — усё зусім не так. А чаму міністр не сказаў пра тое, што пад новую катэгорыю «настаўнік-метадыст» грошай у бюджэце не прадугледжана? Сорамна было? Кіраўнік прафсаюза кажа, што кваліфікацыйная катэгорыя не павінна быць проста часткай іміджу педагога, але насамрэч так і атрымліваецца. Скажыце, навошта настаўніку абараняць свае аўтарскія методыкі, атрымліваць новую кваліфікацыю, калі на яго заробках гэта ніяк не адаб'ецца? А навошта кожныя пяць гадоў пацвярджаць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю, калі розніца ў даплаце — зусім неістотная? Толькі дырэктар у школе будзе Богам? Будзе вырашаць, як заахвоціць таго ці іншага настаўніка? Пры кантрактнай сістэме настаўнікі сталі зусім неабароненымі, таму толькі паспрабуй паспрачацца...

@

Педагог:

А ў Расіі, між іншым, новая геніяльная ідэя нарадзілася — увесці прафесійныя педагагічныя ступені. Выкладчыкаў плануецца падзяліць на некалькі катэгорый: настаўнік-наватар (настаўнік, які займаецца доследна-эксперыментальнай работай і ўкараняе новыя дысцыпліны і методыкі ў школах), настаўнік-метадыст («выкладчык-аратар», які масава перадае інфармацыю), настаўнік-даследчык (настаўнік, які займаецца навукова-даследчай работай) і педагог-настаўнік (ажыццяўляе работу па навучанні і перадачы досведу маладым спецыялістам). Мы ж усё за расіянамі паўтараем. Значыць, у нас усё напарадзе?

@

Анатоль Сафонаў:

Да вышэйшай катэгорыі настаўнікі ідуць дзесяцігоддзямі, некаторыя кладуць на гэта ўсё свае жыццё. Для іх гэта вынік усёй іх педагагічнай дзейнасці. І раптам ад настаўніка, які ўсё жыццё імкнуўся да мэты і дасягнуў яе, напыканцы кар'еры патрабуюць яшчэ нейкага дадатковага пацвярджэння. Можа, у нас зноў якія-небудзь чыноўнікі сядзяць без работы і жадаюць стварыць чарговы цэнтр па выдачы «пуцёвак у жыццё»? Няправільна ўсё гэта. Не мае права на існаванне. Гэта фактычна манаполія на права рухацца наперад. Нават тэхагляд аўтамабіляў праводзяць больш дэмакратычна. А гэта ж жывыя людзі! Лічу, што ў новай інтэрпрэтацыі атэстацыі работнікаў адукацыі дапушчана памылка. Штосьці паспяшаліся зрабіць. Можа быць, камусьці падалося, што вышэйшая катэгорыя настаўнікам далася лёгка? А палічыце час, колькі настаўнік ішоў да вышэйшай катэгорыі, і параўнайце яго з тым перыядам, праз які яму давядзецца яе абараняць (ад каго?). Некаторыя на пенсію сыходзяць з другой ці першай катэгорыяй. Было б правільна ўвесці проста кваліфікацыю «настаўнік-метадыст» і не варушыць «педагагічны вулей» яшчэ адным новаўвядзеннем. Настаўнікі і так ад заробку да заробку перабіваюцца, а калі хто і зарабляе, то працуе пры гэтым на тры стаўкі, пры ўмове што ў школе аплачваюцца максімум дзве.

@

Vladimir:

Калі не будуць істотна павялічаны надбаўкі за кваліфікацыйныя катэгорыі, то значная частка педагогаў адмовіцца ад пацвярджэння вышэйшай катэгорыі.

@

Яўген:

Навошта атрымліваць кваліфікацыю? Надбаўкі адрозніваюцца нязначна. А для кваліфікацыі трэба столькі папер напісаць, што гэта таго не варта!

@

Я:

З такімі падыходамі сапраўдных настаўнікаў праз пару гадоў зусім не застанецца ў школе... Шкада! На месца НАСТАЎНІКАЎ прыйдуць тыя, хто меў пры паступленні 60-70 балаў. Вось такія і будуць пацвярджаць і атрымліваць катэгорыі, або прыйдуць працаваць у міністэрства.

@

Лена:

Усё гэта было зроблена для таго, каб загрузіць Акадэмію паслядыпломнай адукацыі і інстытуты развіцця адукацыі работай. А тое, што псуюць усім нервы — гэта нікога не хвалюе.

@

Таццяна:

Цытата: «Канкрэтных, абсалютна празрыстых і зразумелых усім крытэрыяў зніжэння вынікаў педагагічнай дзейнасці сёння няма». Пытанне аб даплатах не вырашана, а інструкцыю прынялі.

Ад рэдакцыі: *як бачым, пытанні атэстацыі — вельмі хвалюючая тэма для педагогаў. Тэма — злабадзённая, бо ад наяўнасці той ці іншай кваліфікацыйнай катэгорыі напрамую залежаць іх заробкі. Напэўна, таму і бачанне гэтай праблемы ў звычайных педагогаў не супадае з меркаваннем аўтараў новай інструкцыі. «Звязда», па традыцыі, дае магчымасць выказацца ўсім зацікаўленым бакам. Запрашаем да дыскусіі ўсіх, каму ёсць што сказаць па ўзнятай тэме. Ісціна, як вядома, нараджаецца ў спрэчках.*

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА

БЕЛАРУСБАНК 90 лет

Публичная оферта (предложение) о начислении поощрительного дополнительного дохода по срочным банковским вкладам в белорусских рублях

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 1 ноября 2012 года поощрительный дополнительный процентный доход по следующим срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:
- «Классик плюс», «Сберегательный», «Ваш выбор» (вне зависимости от ежедневного остатка вклада) — в размере 9% годовых;
- Накопительный, Премиально-накопительный «Детский», «Новый 2010», «Юбилейный-90» — в размере 7% годовых.
Начисление поощрительного дополнительного процентного дохода производится на ежедневные фактические остатки указанных видов вкладов за период с 01.11.2012 или дня открытия вклада (депозита) после указанной даты по 30.11.2012 (включительно), исходя из количества дней, установленных условиями конкретного вида вклада, для начисления процентного дохода.
Выплата поощрительного дополнительного процентного дохода производится 01.12.2012 при условии, если в период с 01.11.2012 по 30.11.2012 (включительно) по вкладным счетам не совершались любые расходные операции (в том числе: в пределах остатка капитализированных процентов; по предписанию нотариусов; на основании завещательного распоряжения, составленного в банке; на основании свидетельства о наследстве) и не начисляется пониженная процентная ставка.
2. По вкладам «Сберегательный», срок возврата которых наступает в период с 01.11.2012 по 30.11.2012 (включительно), поощрительный дополнительный процентный доход выплачивается в случае выполнения условий, изложенных в пункте 1 настоящей публичной оферты (предложения).
3. Акцептом указанной публичной оферты (предложения) является получение вкладчиком поощрительного дополнительного дохода.

ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 29 октября 2012 года по вновь оформляемым сберегательным сертификатам со сроком обращения 95 дней процентную ставку в размере 43% годовых.

Более подробную информацию можно получить в отделениях банка, в Контакт-центре по телефону 147 и на сайте www.belarusbank.by.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Паэзія і проза «Маладосці»: дэтэктыў узроўню Караткевіча!

«Я спадзяюся, што будзе час, калі нож перарэжа нож». Гэты радок з верша Наталлі Пушкаровай, вядома, не пра «вока за вока, зуб за зуб» — ён пра ісціну ісцін, *«што нарэшце лом ёсць лепшым прыёмам супраць таго, хто супраць таго, хто супраць лому»*. Паэтка прадставіла ў свежым нумары «Маладосці» прэтэнцыёзную падборку вершаў пад назвай «Як гарыць шкло». Яшчэ ў нумары з паэтаў — эпатажны Віктар Лупасін. *«Калі быў слабы і кволы, будзеш смачны, быццам торт»*, — канстатуюць яго радкі. Проза нумара прадстаўлена другой часткай аповесці Уладзіміра Мажылоўскага «Праклён мітрапаліта Феафіла». Не прапусціце добры гістарычны дэтэктыў узроўню Караткевіча! Старонкі побач заняты містычным апавяданнем Генадзя Аўласенкі «Казбек». Галоўны герой тут пярэварацень, але, уявіце сабе, такі, што можна закахацца. Крытыка і публіцыстыка нумара прысвячаецца юбілею Якуба Коласа. Як паўплывала на нацыянальную свядомасць пісьменніка жыццё ў Расіі? Як ставіліся да Коласа на Захадзе? Які ўплыў на маладыя сэрцы і па сёння можа мець яго «На ростанях»? Чаму паэт не даваў у друк прысвячэнні жонцы?

Чытайце «Маладосць» — і будзеце ведаць нашмат больш не толькі пра літаратуру, але і пра жыццё.

Індэкс індывідуальнай падпіскі: 74957.
Адрас у інтэрнэце: www.maladost.lim.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ

Аукцион состоится 6 декабря 2012 г. в 11.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел.: 8(0222)229022, 311185, 223375.

Продавцы недвижимого имущества: по лоту № 1 – Белорусский государственный концерн по нефти и химии, тел. 8(0225) 433012; по лоту № 2 – учреждение образования «Белорусская государственная орденов Октябрьской Революции и Трудового Красного Знамени сельскохозяйственная академия», тел.: 8(0233) 59466, 59454; по лотам №№ 3 и 4 – республиканское производственное унитарное предприятие «Дорводоканал», тел. 8(0222)393561.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 в фонде «Могилевоблимущество» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная с со дня публикации извещения. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **4 декабря 2012 г. с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00.** Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **6 декабря 2012 г. с 10.00 до 10.50.**

№ лота	Сведения о предметах аукциона							Размер задатка, тыс. руб.
	Информация о недвижимом имуществе			Информация о земельных участках			Начальная цена предмета аукциона, тыс. руб.	
	Наименование и краткая характеристика	Место нахождения	Начальная цена недвижимого имущества, тыс. руб.	Площадь, га	Срок аренды, лет	Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка, тыс. руб.		
1	Капитальное строение (здание тяговой подстанции) одноэтажное, кирпичное, 194,5 кв.м	Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Ульяновская, д. 50 А	68 088,770	0,0313	60	28 567,510	96 656,280	15 000,0
2	Незавершенное законсервированное капитальное строение (тепличный комбинат) площадью 885,7 кв.м, готовность строения 46%	Могилевская обл., г. Горки, ул. Новопроектная	106 108,421	1,1230	25	-	106 108,421	10 000,0
3	Водонапорная башня одноэтажная кирпичная, 34,8 кв.м	Могилевская обл., г. Быхов, ст. Быхов	12 204,708	0,0141	10	-	12 204,708	2 400,0
4	Здание насосной станции с пристройкой одноэтажное, кирпичное, 95,8 кв.м	Могилевская обл., г. Быхов, ул. Вильня	13 951,548	0,1598	10	-	13 951,548	2 700,0

Начальная цена недвижимого имущества понижена: по лоту № 1 – на 20 процентов; по лоту № 2 – на 80 процентов; по лотам №№ 3, 4 – на 50 процентов.

Условие для победителя аукциона в отношении земельного участка, право заключения договора аренды которого входит в состав лота № 1, получение в установленном порядке разрешения Бобруйского горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий два года.

Земельные участки по остальным лотам предоставляются победителям (единственным участникам) аукциона в аренду без взимания платы за право заключения договора аренды.

Условие для победителя (единственного участника) аукциона в отношении земельного участка, необходимого для обслуживания недвижимого имущества лота № 2, – получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Горецкого райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения Горецкого районного исполнительного комитета о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.

Задатки перечисляются до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей, и лица без гражданства).

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается **заявление** на участие в аукционе с приложением следующих документов:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия в установленном порядке из Устава либо иного учредительного документа.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Допускается участие в аукционе на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более субъектов малого предпринимательства – индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций (далее – консолидированные участники).

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов от консолидированных участников уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление на участие в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления на участие в нем.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до его проведения, при этом объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в газете «Звязда».

Победитель (единственный участник) аукциона по лотам №№ 1 и 2 – в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка, по лотам №№ 3 и 4 – в течение 10 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола), обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков, на счета получателей, указанные в протоколе аукциона.

Срок заключения договора купли-продажи недвижимого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат. При уклонении одной из сторон от заключения договора купли-продажи недвижимого имущества или договора аренды земельного участка другая сторона вправе обратиться в суд с требованием о понуждении заключить договор, а также о возмещении убытков, причиненных уклонением от его заключения. Договор аренды земельного участка и возникновение основанного на нем права аренды подлежат государственной регистрации в соответствии с законодательством.

Оплата за недвижимое имущество осуществляется денежными средствами по безналичному расчету в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества. Покупателю по его письменному заявлению может быть предоставлена рассрочка оплаты имущества с ежемесячной индексацией платежей.

Информация об объектах, предлагаемых к продаже, размещена на сайтах Могилевского областного исполнительного комитета **region.mogilev.by** и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by**.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА на право заключения договора аренды земельного участка в г. Орше

№ п/п	Месторасположение и площадь земельного участка	Начальная цена продажи (руб.)	Условия заключения договора аренды	Инженерное обеспечение участка	Сумма задатка (руб.)
1.	Право заключения договора аренды земельного участка по ул. Дзержинского, около модульного магазина УП «ДОРОРС» в г. Орше площадью 0,0024 га. Кадастровый номер 242400000001012165	495 512	Срок договора – 5 лет. Целевое использование – для установки павильона для осуществления розничной торговли и оказания услуг населению (размещение объектов розничной торговли).	В квартале застройки по ул. Дзержинского, где расположен земельный участок, имеются сети водоснабжения, канализации и электрической связи, с возможностью подключения к ним предполагаемого объекта. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: централизованное газоснабжение – отсутствует, централизованное теплоснабжение – отсутствует, электроснабжение – имеется, наличие асфальтированного подъезда – имеется, центральное водоснабжение – имеется, участок находится в санитарно-защитной зоне, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – имеется.	49 550

1. **Аукцион состоится в 11.00 15 ноября 2012 г. в г. Орше в здании Оршанского горисполкома по ул. Островского, 2.**

2. Для участия в аукционе необходимо подать заявление. К заявлению прилагается документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет Оршанского горисполкома № 3642304000494 в ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801647, УНП 300053911, с отметкой банка, а также представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

3. Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан:

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения;

- не позднее двух рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнения условий, указанных в протоколе о результатах аукциона, заключить с Оршанским горисполкомом договор аренды земельного участка;

- в срок до 19 января 2013 года обратиться в установленном порядке за государственной регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок;

- получить в установленном порядке разрешение на проектно-изыскательские работы и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий один год;

- в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления;

- осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

